незалежная газета

# Наша Ніва

№ 10 (608) 11 сакавіка 2009

www.nn.by

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Растаптаны гонар Яні Паляковай**

Старонка 6



**Што за жанчына была з Лукашэнкам у аэрапорце?**

Старонка 8

**Вялікая босая Сэзарыя Эвора**

Старонка 7



## У НУМАРЫ

**Курс даляра дапоўз да 2900**

і можа перавысіць чарговую планку ўжо на гэтым тыдні. **Старонка 4.**

**Прысуд прыватнаму сектару**

Паводле новага генплану развіцця сталіцы месца яму ў межах кальцавой амаль не будзе. **Старонка 4.**

**Зрабіць трэба яшчэ вельмі шмат**

Піша ў сваім артыкуле напярэдадні візіту ў Мінск Еўракамісар Беніта Ферэра-Вальднэр. **Старонка 5.**

**«Вы меня не предали — разочаровали»**

Спявак Вахтанг Кікабідзэ выпусціў песню-зварот да расійскай інтэлігенцыі. **Старонка 8.**

**Пенсіянерка села на лаву падсудных за апаганьванне магілы**

Незвычайны працэс завяршыўся днямі ў судзе Пастаўскага раёну. **Старонка 9.**

**Эратычнае фота студэнткі Акадэміі міліцыі выклікала санкцыі**

Мадэльку папрасілі надалей «не ганьбіць гонар беларускай міліцыі». **Старонка 9.**

**Без шуму і пылу**

хавалі ў Бабруйску злодзея ў законе Уладзіміра Бірукова. **Старонка 10.**

# Беларусь Freedom

Канцэрт «Ляпісаў» у Палацы спорту сабраў 9000 гледачоў.



Юлія Дарашкевіч

# На парозе важных рашэнняў

12—13 сакавіка Беларусь з афіцыйным візітам наведае Еўракамісар у замежных сувязях і палітыцы добрасуседства **Беніта Ферэра-Вальднэр**.

Гэта ўжо другі камісар Еўрасаюзу, які цягам месяца наведвае Мінск. Першым у лютым у Беларусь прылятаў Хаўер Салана.

«Мы сапраўды бачым магчымасць наблізіць Беларусь да Еўропы і гатовыя шмат для гэтага зрабіць», — заявіла напярэдадні прыезду еўрачыноўніца. Таксама Ферэра-Вальднэр закранула пытанне ўваходжання Беларусі ў праграму «Усходняга партнёрства». «Каб гэта адбылося, мы хочам бачыць у Беларусі больш палітычных рэформ», — сказала камісар. Сённяшнюю сітуацыю яна ацаніла як «два крокі наперад, крок назад».

Ужо ў сакавіку новую палітыку Еўрасаюзу на ўсходнім кірунку павінны ўхваляць кіраўнікі краін, якія ўваходзяць у злучнасць. А ўстаноўчы саміт «Усходняга партнёрства» пройдзе 7 мая ў Празе. Да ўдзелу ў праграме «Усходняга партнёрства» запрошаныя шэсць постсавецкіх краін — Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна. Пакуль пад пытаннем толькі ўдзел Беларусі.

Цягам найбліжэйшых тыдняў і павінна вызначыцца, ці паедзе ў чэшскую сталіцу Аляксандр Лукашэнка. Адчуваючы важнасць моманту, па вяртанні з Сербіі Лукашэнка зрабіў некалькі незалежніцкіх заяваў. У прыватнасці, падчас адкрыцця будынку Оперы ён заявіў: «Калі мы суверэнныя і незалежныя, а не нейкая там правінцыя нейкай там дзяржавы, то ў гэтай дзяржаве трэба ствараць сімвалы суверэнітэту і незалежнасці».

Яшчэ на адпачынку, у Капаоніку, кіраўнік краіны закрануў пытанне прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. «У нас ёсць новы парламент, і яны будуць прымаць рашэнне, я не буду даваць ім ніякіх указанняў».

**Працяг на старонцы 3.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — **старонка 2**.




Наша Страва

Сапраўдная беларуская кухня

Шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Belarus Freedom!

**9 сакавіка «Ляпіс Трубяцкой» нарэшце прэзентаваў у Мінску нашумелы альбом «Маніфест». Каля 9 тысяч чалавек прыйшло ў Палац спорту на Нямігу, каб пачуць любімы гурт.**


BELAPAN.COM

Каб трапіць у сам палац, трэба было прастаяць шматметровую чаргу. Амонаўцы старанна трэслі ўсіх, каб ніхто не пранёс нічога забароненага. Такога ажыятажу не было нават падчас прыезду сусветных зорак, як Тар’я Турунен і Sepultura.

Што да самога канцэрту, то ён удаўся без усялякіх але, незадаволеных у гэты вечар не было. Ужо ад першай песні — «Да нас прыехаў Трубяцкой» — зале быў зададзены адпаведны тон. Тыя, хто быў на танцпляцоўцы, ужо маглі выкручваць ад поту свае кашулі і майкі. Усе адрываліся па поўнай.

Увесь у татуіроўках Міхалок даваў жару, не шкадуючы сваёй глоткі (голас сарваў ужо ў першай частцы выступу) і таксама іншых частак цела. На працягу ўсяго выступу музыкі здзяйснялі неймаверныя акрабатычныя трукі.

У перапынках між выступамі Міхалок чытаў «эпічныя чыталкі» Юзіка Кілевіча, а таксама ўласныя маналогі. Напрыклад, пра тое, што нас прымушаюць сябраваць з Венесуэлай. Кожная песня суправаджалася адмысловым відэашэрагам. Калі пачалі выконваць «Капітал», на сцяне з’явіліся і кадры з вядомага кліпу. Было цікава, ці пакажуць ППРБ. Не, не паказалі. З усіх пяці дыктатараў, што фігуравалі ў кліпе, паказалі толькі нябожчыка Хусэйна. Лукашэнку з Кастра, Чавесам і Ахмадзінежада ўсё ж выразалі.

Калі загучала першая беларускамоўная песня «Зорачкі», у натоўпе з’явіўся адзін бел-чырвона-белы сцяг. Потым другі. Ніхто так і не спрабаваў іх адабраць. І сцягі пралуналі аж да заканчэння канцэрту.

«Вярніце нам павагу без крыві і рэвалюцыі», — папрасіў са сцэны Міхалок перад тым, як пачаў спяваць «Залаты гадзіннік у чорнай вароны, Хлопец дурны, як малпа з каронай». І ўся зала ў агульным парыве спявала пра Пагоню, што побач, а таксама паўтарала бясконцую колькасць разоў следам за артыстам Belarus freedom. Гэтая песня ўпершыню была выкананая на Радзіме, насуперак ранейшым заявам, што ў Беларусі яе спяваць не будуць. Новыя «Ляпісы» заўважна кантрастуюць з былымі апальнымі рок-гуртамі, якія пасля славутага паходу ў Адміністрацыю прэзідэнта пазбягаюць выконваць на канцэртах свае найбольш палітычныя і праваканцыйныя кампазіцыі. Чаго баяцца, калі за табою — 9-тысячная зала?

«Ляпісы» выканалі амаль усе песні з новага альбому, а таксама частку старых хітоў. На біс гурт заспяваў яшчэ дзве абсалютна новыя тэмы — «Буравеснік» і «Вясёлыя качкі». Цяпер гурт чакае турнэ па іншых гарадах краіны. Напэўна, і там будзе не менш горача.

**Зміцер Панкавец**

**«Агеньчыкі» на першым месцы**

«Ляпіс Трубяцкой» працягвае трымаць пазіцыі аднаго з наймацнейшых гуртоў постсавецкай прасторы. 7 сакавіка, відэакліп на песню «Ляпісаў» «Агеньчыкі» быў прызнаны найлепшым у Маскве на «Чартавым тузіне». Зняў яго беларускі рэжысёр Аляксей Церахаў.

**НБ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю — **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"
Агулам
Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"
Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**
дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Дзмітрыю В., А.Ф., Галіне Л., Наталлі Б., Яўгену Ч., Уладзіміру В., В.К., Л.Ц., Дзмітрыю С., Д.М., І.Х., В.Дз., Ю.Г., Сафіі В., Алене А., Алене М., І.Г., Генадзю К., Аляксандру А., Ірыне Ф., Аляксандру А., А.Е., Уладзіміру В., Наталлі Б.** з Гродна.
**Т.Ш., Святлане Ц., Л.Л., Л.А., Вячаславу В.** з Маладзечанскага раёну.
**Мікалаю К., Вадзіму С., Міхаілу С., Віктару Н., Валянціну Д.** з Мінскага раёну.
**Аляксандру К., Р.Р., Валерыю П.** з Баранавіцкага раёну.
**Святаславу Г., Валянціне А.** з Талачынскага раёну.

# На парозе важных рашэнняў

Працяг са старонкі 1.

На думку некаторых экспертаў, менавіта пытанне прызнання/непрызнання каўказскіх дзяржаваў і ёсць галоўным фактарам у тым, ці запросяць Лукашэнку ў Прагу, а адпаведна і ў далейшым супрацоўніцтве Беларусі і ЕС. Дырэктар лонданскага Цэнтру еўрапейскіх рэформаў Чарлз Грант наадварот лічыць гэтае пытанне другасным, а вось пытанне павагі да правоў чалавека і дэмакратыі — першасным. Маўляў, хоча Беларусь далучыцца да Нікарагуа, Хамасу і Хезбалы ў пытанні прызнання — на здароўе, а вось якое можа быць збліжэнне з Еўропай, калі там дыктатуры не цярпяць.

Тым часам з дыпламатычных крыніцаў у Варшаве польскім СМІ стаў вядомы іншы пункт напружання. Польшча паставіла Мінску фактычны ультыматум: або беларускія ўлады перастануць шпыняць незалежны Саюз палякаў у Беларусі, або Лукашэнка не атрымае запрашэння на еўрапейскую сустрэчу ў вярхах.

Непрызнаны Саюз палякаў на чале з Анжалікай Борыс падтрымаў і лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч. Палітык заявіў, што лічыць дзеянні польскага ўраду цалкам адпаведнымі нормам дэмакратычнага еўрапейскага грамадства, якое рашуча бароніць правы сваёй нацыянальнай меншасці.



«Рэпрэсіі супраць Саюзу палякаў Беларусі не проста недальнабачныя, яны шкодныя нацыянальным інтарэсам, нашым перспектывам у еўраінтэграцыі. Для нас стратэгічна важна максімальна выкарыстоўваць шчырае жаданне нашых суседзяў заангажаваць еўрапейскія структуры ў развіццё эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва з Беларуссю», — нагадвае А.Мілінкевіч.

Калі Мілінкевіч працягвае падтрымліваць інтэграцыю Беларусі ў еўрапейскую супольнасць без усякіх папярэдніх умоваў, дык іншыя палітыкі займаюць больш жорсткую пазіцыю. Такія, як Лявон Баршчэўскі, Аляксандр Казулін, Андрэй Саннікаў.

У той жа танальнасці былі вытрыманыя заявы двух маладзевых лідэраў – Змітра Дашкевіча і Яўгена Афнагеля. Лідэры «Маладога фронту» і «Еўрапейскай Беларусі» звярнуліся з заклікам выйсці на Кастрычніцкую плошчу з партрэтамі палітвязняў і Яні Паляковай у дзень прыезду Беніты Ферэры-Вальднэр 12 сакавіка. Яшчэ адзін тэст на лаяльнасць.

На думку Дашкевіча і Афнагеля, гэта кулуарныя перамовы з дыктатарам, якія не прынясуць сапраўдных пераменаў. Хлопцы заклікаюць запатрабаваць ад уладаў спынення палітычных рэпрэсіяў, сапраўднай лібералізацыі і выканання умоваў Еўрапейскага Саюзу.

Падобна на тое, што еўрапейцы схіляюцца ўсё ж да запрашэння Лукашэнкі ў Прагу. Беларускі кіраўнік блізкі да таго, каб Еўропа ставілася да яго, як да Аліева ў Азербайджане. Ніхто не адмаўляе фактаў некаторых парушэнняў правоў чалавека, але інтэнсіўнасць адносінаў ад гэтага не змяншаецца.

**Зміцер Панкавец**

## Блогеры tonkacheva і nescerka крытыкуюць Алега Гулака

Папулярныя беларускія блогеры tonkacheva і nescerka паднялі тэму дзейнасці старшыні Беларускага Хельсінскага камітэту Алега Гулака.

Блогерка tonkacheva расказвае пра выпадак, які здарыўся на прыёме з прычыны прыезду дэлегацыі ПАРЕ ў Мінск, дзе адбылася размова з «калегам па праваабарончай дзейнасці, запрошаным для ўдзелу ў грамадскай радзе пры Адміністрацыі прэзідэнта». Маецца на ўвазе старшыня БХК Алег Гулак.

Суразмоўца tonkacheva-й пачаў гаварыць пра тое, што «мы назіраем паляпшэнне. Патрабаванні Еўрасаюзу так ці інакш выконваюцца. У адносінах акцый паводзіны ўладаў сталі менш брутальнымі». На пытанні пра акцыі моладзі 14 і 16 лютага праваабаронца адказаў, што «14-га толькі выцiскалі з Плошчы. І ўвогуле, патрэбна разабрацца, навошта гэтыя акцыі былі арганізаваныя, магчыма, якраз да прыезду еўрапейскіх дэлегацый».

Nescerka таксама прыводзіць прыклад, што на свае вушы чуў, як на Радзе еўрапейскай інтэграцыі Алег Гулак выказваўся наконт таго, што затрыманне Арцёма Дубскага цалкам адпавядае нормам закону. Прысутным прыйшлося нагадаць, што на «хімію» яго зацягнулі па паклёпе і, значыць, незаконны прысуд юрыдычна нікчэмны.

Гулак «нібыта спрабуе ўзважыць усё аб'ектыўна, а гэта выглядае як апраўданне рэпрэсій. Гэта так і выглядае — што БХК пачынае дзейнічаць у рамках нейкага падспуднага кантракту з уладай, якая дазваляе вам існаваць у краіне легальна», — падводзіць вынік nescerka.

**ЗП**

**Блог**

дзённік, які вядзецца адкрыта, у інтэрнэце. Палітычныя блогі набылі папулярнасць і ўплыў у розных краінах.

## СЦІСЛА

### Лукашэнка: Беларусь не разглядае ніводнай дзяржавы ў якасці праціўніка

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас абмеркавання задумы аператыўна-стратэгічных вучэнняў «Захад-2009».

### Няўрадавыя арганізацыі правялі ў Мінску асамблею

Яна была першай пасля 4-гадовага перапынку. На яе з'ехаліся прадстаўнікі 330 арганізацый, што працягваюць сваю дзейнасць незалежна ад дзяржавы.

### Севярынец з візітам у Страсбургу

9—10 сакавіка сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Павал Севярынец правёў шэраг сустрэчаў з кіраўнікамі камітэтаў Еўрапарламенту, Рады Еўропы, еўрадэпутатамі і экспертамі. Асноўнай тэмай візіту ў Страсбург было пытанне свабоды веравызнання і дэмакратычных зменаў у Беларусі, а таксама падрыхтоўка далучэння новастворанай БХД да Еўрапейскай народнай партыі, якая яднае партыі правага кірунку. Сустаршыню БХД суправаджаў дарадца лідэра Руху за Свабоду Алесь Лагвінец.

### Ездзяць і ездзяць

9 сакавіка ў Мінск прыбыла дэлегацыя Парламенцкай асамблеі АБСЕ на чале са старшынём ПА Жаао Саарэшам. 11 сакавіка яна возьме ўдзел у семінары «Паляпшэнне клімату для прыцягнення замежных інвестыцый», арганізаваным пры падтрымцы Фонду Эберта.

### Інтэрнэтам карыстаецца 21,7% насельніцтва

Такі вынік дало даследаванне, праведзенае ў Беларусі кампаніяй Gemius. Дзве траціны з іх — моладзь.

### На допыт выклікаюць цешчу

Як толькі Георгій Дзмітрук стаў сустаршынём Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, супрацоўнікі КДБ правяліператрус у ягоным кобрынскім офісе. Яны забралі ўсю дакументацыю, а таксама ўручылі позвы жонцы святара і ягонай цешчы на допыт. Прычынаў ператрусу Георгію Дзмітруку не паведамляюць.

**МБ; БелаПАН, БЕЛТА, радыё «Свабода»**

# Курс даляра дапоўз да 2900 рублёў

і можа перавысіць чарговую планку ўжо на гэтым тыдні.

Супрацоўнікі сталічных банкаў прызнаюць, што курс даляра будзе расці да 3100—3300 беларускіх рублёў.

Некаторыя эканамісты праркуюць, што да канца году ён дасягне 4000 рублёў, але гэта станецца толькі ў тым выпадку, калі крызіс будзе развівацца па песімістычным сцэнары і пазыкаў з Расіі і МВФ будзе замала, каб выплачваць заробкі.

Ад часу, калі 2 студзеня Нацбанк правёў разавую дэвальвацыю на 20%, курс даляра падрос прыкладна на 10%, а расійскага рубля, наадварот, на 10% знізіўся.

**МБ**

# Піва — праз прэзідэнцкі спартовы клуб?

Паводле інфармацыі сайту afn.by, у калідорах улады распрацаваны план прыватызацыі яшчэ двух бровараў.

На першым этапе ААТ «Крыніца» і ААТ «Брэсцкае піва» маюць аб’яднацца ў холдынг, 51% акцый якога пяройдзе ў кіраванне прэзідэнцкага спартовага клубу, а 49% застануцца пад кантролем цяперашняга галоўнага акцыянера гэтых двух прадпрыемстваў, канцэрну «Белдзяржхарчпраму».

На другім этапе на беларускі рынак павінна ўвайсці кампанія SABMiller — адзін з лідэраў рынку.

Паводле выдання, угодзе пасярэднічаюць аўстрыйскія кампаніі, блізкія да старшыні рады акцыянераў кампаніі «Белтехэкспарт» Уладзіміра Пефціева. Гэты бізнэсовец, быццам бы, прысутнічаў пры абмеркаванні ўгоды з прэм’ерам С.Сідорскім.

Прэзідэнцкі спартовы клуб узначальвае малодшы (сярэдні?) сын А.Лукашэнкі Дзмітры.

Піваварства — прыбытковая сфера, асабліва ў краінах, дзе моцныя напоі паступова замяняюцца слабымі па меры росту дабрабыту насельніцтва.

**МБ**

# Прагнозы ўсё горшыя

Сусветная эканоміка можа зазнаць самы вялізны спад за перыяд пасля Другой сусветнай вайны, гаворыцца ў прагнозе Сусветнага банку.

Спад у гандлі будзе самым моцным за апошнія 80 гадоў. Прамысловая вытворчасць у свеце да сярэдзіны гэтага году скароціцца на 15% проці леташніх паказчыкаў. З такім прагнозам выступіў Сусветны банк увечары 8 сакавіка ў Вашынгтоне.

Падрабязнасці дакладу будуць прадстаўленыя Сусветным банкам на сустрэчы міністраў фінансаў і кіраўнікоў цэнтрабанкаў краінаў «вялікай дваццаткі», якая адбудзецца 14—15 сакавіка ў Лондане, паведамляе агенцтва dpa.

Застаецца радавацца, што крызіс не дасягне памераў Вялікай дэпрэсіі, пасля якой пачалася сусветная вайна.



NV-ONLINE.INFO

Элітным раёнам знос не пагражае. У гэтым доме каля праспекту Машэрава пражывае экс-спікер палаты прадстаўнікоў Уладзімір Канаплёў.

# Прысуд прыватнаму сектару

Паводле новага генплану развіцця сталіцы ў межах кальцавой месца для прыватнага сектару амаль не будзе.

Папярэдні генеральны план развіцця Мінску быў прыняты шэсць гадоў таму. За гэты час ён састарэў, і прыйшлося складаць новы. Праца яшчэ працягваецца. Праект чакае ўзгаднення з рознымі муніцыпальнымі структурамі і зацвярджэння экспертаў.

Навінак у ім хапае. Распрацоўшчыкі хочуць павялічыць тэрыторыю Мінску больш чым у паўтара разу, вынесці з межаў гораду большасць заводаў... Усё пералічанае не павінна выклікаць ніякіх спрэчак, чаго не скажаш пра наступныя ідэі.

Па-першае, гэта будаўніцтва трасы ў абыход Мінску, якая звяжа віленскі і кіеўскі кірункі. Жыццё вёсак, каля якіх пойдзе абходная, зменіцца.

Другая праблема звязаная са зносам прыватнага сектару. Ранейшы (яшчэ дзейсны) генплан прадугледжваў частковае захаванне прыватных дамоў і нават будаўніцтва новых, цяпер ад такой ідэі выРашана адмовіцца. Мінску пагражае масавае перасяленне прыватнага сектару. Распрацоўшчыкі абяцаюць, што гэта не закране элітныя раёны з сучаснымі катэджамі. Сапраўды, было б дзіўна, каб на месцы Драздоў з рэзідэнцыяй Лукашэнкі быў запланаваны шматпавярховы дом для чарговых ільготнікаў. Неэлітным жыхарам можна рыхтавацца да найгоршага варыянту. Праўда, калі ўзгадаць, з якім вэрхалам руйнаваліся дамы ў раёне будаўніцтва метро, як людзі абаранялі свае кватэры на вуліцы Маркса, можна зразумець, што знос прыватнага сектару стане глабальнай праблемай для сталічных уладаў.

Блізкая да папярэдняй і ідэя будаўнітва трэцяга транспартнага кола. Праўда, колам праектаваную трасу можна назваць з вялікай нацяжкай. Траса, якая абапіраецца на ўжо пабудаваныя вуліцы Гарэцкага, Алібегава, Малініна, Радыяльную і шэраг іншых, усё роўна захопіць і прыватны сектар у Курасоўшчыне, Лошыцы, Зялёным Лузе. Але хто менавіта стане ахвярай новага будаўніцтва і калі жыхароў праінфармуюць пра новыя ідэі сталічных кіраўнікоў — пытанне застаецца адкрытым.

У праекце генплану не прапісана ніякай канкрэтыкі: ніхто не можа даць гарантыі, што ён не будзе зноў пераглядацца. Кіраўнік Мінгарвыканкаму Міхаіл Паўлаў нават рэкамендаваў уносіць дапаўненні і змяненні кожныя два гады. Цалкам магчыма, што іншы мэр ці іншыя праекціроўшчыкі пачнуць праводзіць супрацьлеглую палітыку і, напрыклад, заахвочваць будаўніцтва прыватных катэджаў.

**Ягор Марціновіч**

# Рэйтынг найлепшых аграсядзібаў

Падведзеныя вынікі рэспубліканскага конкурсу на найлепшую аграэкасядзібу году, які арганізавалі суполка «Адпачынак у вёсцы» і «Белаграпрамбанк». Акрамя намесніка міністра спорту і турызму Ч.Шульгі, першага намесніка старшыні праўлення «Белаграпрамбанку» У.Падкавырава і старшыні БГА «Адпачынак у вёсцы» В.Кліцуновай у складзе журы працавалі мастацтвазнавец Яўген Сахута, фалькларыст Алесь Лозка, этнолаг Тадэвуш Навагродскі, архітэктар Сяргей Сергачоў.

Гран-пры атрымала сядзіба «Над Нёманам» (г.Бярозаўка Лідскага раёну).

Пераможцам жа ў намінацыі за захаванне традыцый стала Вольга Маханенка, гаспадыня сядзібы «Прыазёрная» з вёскі Стары Лепель Лепельскага раёну. Яна працуе ў аддзеле спорту і турызму Лепельскага райвыканкаму. На працы ўжо прывыклі, што яна размаўляе пабеларуску. На свае імпрэзы ходзіць у нацыянальным строі. Цудоўна ведае нацыянальную традыцыю. Збірае старыя рэчы, арганізуе выставы ў сябе на сядзібе. Вользе добра дапамагае яе сяброўка Галіна Жураўлёва, майстрыха выцінанкі.

Гасцям прапануецца краязнаўчы маршрут: Стары Лепель (гарадзішча на возеры, каменныя крыжы), Акана (фальклорны ансамбль «Аканіца»), Аношкі (ансамбль «Аношкі» праводзіць з гасцямі язычніцкую гульню «Жаніцьба Цярэшкі»).

Ад імя Таварыства беларускай школы Вользе Маханенка дастаўся прыз — турыстычная паездка ў Варшаву.

**А.Алесеў**

**Гран-пры** — сядзіба «Над Нёманам» (Лідскі раён). У якасці ўзнагароды гаспадары Аксана і Валерый Сялькоўскія паедуць па турыстычных пуцёўках на італьянскі востраў Сардынія.

**Намінацыя «Гасціннасць»** — сядзіба «На Зарэчнай вуліцы» (Кобрынскі раён).

**Найлепшыя зялёныя сядзібы** — «Кролава хата» (Расонскі раён) і «Дакудава» (Лідскі раён).

**Намінацыя «Стыль і гармонія»** — сядзіба «Вязынка» (Маладзечанскі раён)

**Намінацыя «Здаровы лад жыцця»** — сядзіба «Пясчаны бераг» (Быхаўскі раён).

**Намінацыя «За захаванне беларускіх традыцый»** — сядзіба «Прыазёрная» Лепельскага раёну.



Да Вольгі Маханенка (справа) турысты едуць цугам.

# Зрабіць трэба яшчэ вельмі шмат

**Мой візіт 13 сакавіка — гэта ясны сігнал аб тым, што Еўрапейскі Саюз у прынцыпе гатовы аднавіць свае адносіны з Беларуссю і яе народам. Піша Еўрапейскі Камісар у замежных сувязях і палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднэр.**

Еўрапейска-беларускія адносіны знаходзяцца на ростанях, і мы хочам скарыстаць гэтую магчымасць для таго, каб пабудаваць узаемавыгадныя стасункі. Я маю намер абмеркаваць з уладамі і грамадзянскай супольнасцю, што ЕС і Еўрапейская Камісія могуць прапанаваць Беларусі, а таксама, што можа зрабіць Беларусь, каб развіць гэты патэнцыял у найбліжэйшай будучыні.

Сённяшняя больш пазітыўная дынаміка стала магчымай, дзякуючы вызваленню трох палітычных зняволеных мінулым летам. Такое развіццё падзей дазволіла ЕС прыпыніць дзеянне візавых абмежаванняў для некаторых асобаў і ўступіць у дыялог з Беларуссю пасля некалькіх гадоў абмежаваных кантактаў.

Я мяркую, што ЕС мае багата чаго прапанаваць Беларусі і яе народу, калі Беларусь прадэманструе свае сур'ёзныя намеры па аднаўленні адносінаў з намі.

Цяпер ЕС распрацоўвае праграму «Усходняга партнёрства» са сваімі ўсходнімі суседзямі. Беларусь можа стаць удзельніцай гэтага партнёрства, якое аб'ядвае 27 краінаў-чальцоў ЕС з Украінай, Малдовай і краінамі Паўднёвага Каўказу. Гэта шанец пакінуць у мінулым гады ізаляцыі, якія доўжыліся зашмат, і ўступіць у палітычны і эканамічны абмен з рэштай еўрапейскай сям'і.

А канкрэтна, ЕС патэнцыйна мог бы прапанаваць супрацоўніцтва з Беларуссю, якое простыя грамадзяне адчулі б на сабе. Мы маглі б працаваць разам з вамі, каб дапамагчы беларускай эканоміцы дапасавацца да новых эканамічных выклікаў у рэгіёне. Мы маглі б дапамагчы вам скасаваць бар'еры ў гандлі з нашымі краінамі-чальцамі праз падтрымку мераў, скіраваных на прывядзенне вашых тавараў у адпаведнасць са стандартамі ЕС. ЕС хацеў бы інтэнсіфікаваць нашы кантакты ў галіне энэргетычнай бяспекі. І, калі ўсё будзе добра, можа таксама з'явіцца болей магчымасцяў для беларускіх студэнтаў навучацца ў ЕС і спросціцца візавыя працэдуры для іншых грамадзянаў, якія ездзяць у ЕС.

Зразумела, усё гэта будзе залежаць ад таго выбару, які зробіць Беларусь. Болей крокаў у кірунку асноўных свабодаў і дэмакратычных рэформаў дазволіць нам з вамі мець больш цесныя стасункі. Беларусь павінная прымаць свае ўласныя суверэнныя рашэнні аб сваім уласным лёсе.

За апошнія тры месяцы мы бачылі некалькі сігналаў, якія нас заахвоцілі. Акрамя вызвалення палітычных зняволеных, мы прывіталі адмену абмежаванняў для двух асноўных незалежных газетаў, якія за гэты час ізноў пачалі друкавацца і распаўсюджвацца; мы былі радыя ўбачыць рэгістрацыю арганізацыі «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча, а таксама правядзенне кансультацый па выбарчай рэформе паміж Беларуссю і Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ 22 студзеня.

І мы пільна сачылі за адкрыццём некаторых новых магчымасцяў для дыялогу паміж урадам і грамадзянскай супольнасцю. Упершыню грамадзянская супольнасць і апазіцыя былі запрошаныя для абмеркавання на высокім узроўні, з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі прэзідэнта, пытанняў СМІ, у тым ліку, карыстання рэсурсамі інтэрнэту, і будучыні Беларусі ўвогуле. Гэта знак таго, што час мяняецца і, магчыма, мяняюцца і адносіны.

Усё гэта заахвочвае, але зрабіць трэба яшчэ вельмі шмат.

Калі мы збіраемся пачаць новую главу ў нашых адносінах і калі мы збіраемся пацвердзіць рашэнне аб прыпыненні візавых абмежаванняў, мы павінны ўбачыць больш прагрэс у гэтым пазітыўным кірунку і ясныя сігналы аб тым, што ўрад мае намер працягнуць рух па шляху дэмакратычных рэформаў.

ЕС лічыць, што кожны павінен мець права выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам, і мы будзем працягваць заклікаць беларускія ўлады супрацоўнічаць з БДІПЧ АБСЕ у пытаннях рэформаў выбарчага заканадаўства. Мы лічым, што доступ да незалежнай інфармацыі і свабода выказвання з'яўляюцца асноўнымі правамі, якія мусяць паважацца. Гэта значыць, што журналістам павінна быць дазволена працаваць вольна — без запалохванняў і пераследу, без страху закрыцця газетаў або перашкодаў для іх распаўсюду. Мы рэгулярна ўздымаем пытанне аб неабходнасці паляпшэння сітуацыі з недзяржаўнымі арганізацыямі, якія для нас ёсць жыццёва важнай часткай грамадства. Мы будзем працягваць заклікаць да прагрэсу ў галіне свабоды сходаў у Беларусі, таму што мы лічым іх нармальнай часткай працэсу публічнага абмеркавання.

Пабудова адносінаў з любым партнёрам павінна быць вуліцай з двухбаковым рухам, і, як я ўжо зазначыла, мы багата можам прапанаваць Беларусі. Калі Беларусь зробіць выбар на карысць рэформаў і большай адкрытасці, ЕС гатовы даць пазітыўны адказ і дапамагчы Беларусі, дзе толькі магчыма. Мы пачалі працаваць над прапановамі, і мы гатовыя прапанаваць Беларусі ўсе перавагі нашай Еўрапейскай палітыкі добрасуседства. Я хацела б бачыць, як Беларусь працуе разам з ЕС на карысць большага дабрабыту і большай павагі да індывідуальных правоў у партнёрстве роўных. Выбар зараз за вамі.

АКЦЭНТЫ

## Лукашэнка: Візіт у Сербію нічога не каштаваў

Пра гэта ён заявіў журналістам 8 сакавіка. «А колькі гэта каштавала? Столькі, колькі каштуе абслугоўванне прэзідэнта ў іншых краінах? Мяркую, што для нашага бюджэту гэта ніколькі не каштавала», — сказаў ён.

Калі для нашага бюджэту нічога не каштавала тыднёвае перабыванне дэлегацыі на курорце — прычым не маленькае дэлегацыі, якая змясцілася на двух самалётах, — то хто плаціў за прэзідэнта? І дзеля чаго гэты нехта траціць на адказнага беларускага чыноўніка такія грошы?

## Найгоршы варыянт КПСС

Так **Міхаіл Гарбачоў** назваў «Адзіную Расію».

Былы прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў выступіў з рэзкай крытыкай сённяшняга кіраўніцтва Расіі, абвінаваціўшы яго ў адыходзе ад прынцыпаў свабоды і дэмакратыі.

Паводле ягоных словаў, «Адзіная Расія», якой кіруе Уладзімір Пуцін, «гэта партыя бюракратаў, найгоршая версія КПСС».

Ён таксама крытычна выказаўся пра «самаўпэўненасць» Захаду, які не бачыць урокаў з краху сацыялістычнай сістэмы.

## Мост уз'яднання беларускага народу

**Пры рэканструкцыі мосту цераз Нёман сёлета замуравалі нішы, якія савецкія праекціроўшчыкі прадугледзелі, каб пераправу лёгка было знішчыць, калі зноўку будзе падыходзіць вораг. Піша Сяргей Астравец.**

Мост злучаў праз Нёман дзве часткі Гродна. Злучаў яшчэ на пачатку мінулага году. Чыгунныя краты мелі дату, а шыльды на мосце паведамлялі, што ён пабудаваны ў 1949 годзе ў гонар 10-годдзя гэтага самага ўз'яднання.

У горадзе, дзе надпісаў, датаў у камені ці жалезе амаль няма, гэта ўспрымалася з цікавасцю, больш за тое, с задавальненнем.

Яго закрылі на перабудову ў палове студзеня, дакладна ў сярэдзіне мінулай восені зноўку адкрылі рух, пашырыўшы ўдвая і ўзняўшы амаль на паўтары метра. Карацей, стаханаўская будоўля атрымалася. Зрабілі сапраўды выгаднейшым, зручнейшым і сучаснейшым. Наперад было зразумела, што краты ўз'яднання знікнуць назаўсёды. З аднаго боку, патрэба ў іх мінула: падзелены напалам гляк склеілі, дакладней, зляпілі наноў, падгартавалі нават. З іншага, шкада, канечне.

Хаця рэальна большасць людзей мост называла папросту Старым, вось і ўсё.

Пераправа цераз Нёман прыблізна тут існавала заўжды, крыху больш управа або ўлева.

Гэтаму канкрэтна мосту гадоў сто, і вось што самае дзіўнае, нечаканае: яго вырашылі больш ніколі не ўзрываць... Газеты паведамілі як пра казус: будаўнікі раптам натрапілі ў маставых апорах на пустыя нішы, выклікалі спецыялістаў і тыя патлумачылі — гэта поласці для закладкі дынаміту! Нават у 1949-м мост адбудавалі, прадугледзеўшы абавязковую магчымасць яго знішчыць, калі будзе зноўку падыходзіць вораг, хаця савецкія войскі густа стаялі тады ажно да Эльбы.

Яшчэ больш нечаканым мне здалося тое, што, не доўга думаючы, студні для дынаміту ўзялі ды замуравалі, іх больш няма! Замуравалі, не ўзгадняючы з Саветам абароны, з Вярхоўным галоўнакамандуючым, з Радай бяспекі і нават на Лубянку, атрымліваецца, не паведамілі... Уяўляеце? Яны больш не баяцца вермахту, бундэстагу, абверу, бундэсверу і нават Пентагону! Яны толькі ствараюць буры ў шклянцы з вадою па яшчыку, каб тлуміць галаву насельніцтву ўяўнымі ворагамі і пагрозамі. А насамрэч яны болей не збіраюцца адступаць за Нёман, патрыятычна абараняць крэпасць-герой, бо ведаюць: ніхто наступаць болей ніколі не будзе, прынамсі з заходняга боку.

Я паставіў кропку і мне раптам падумалася: а можа, мост пакідаюць, каб мець магчымасць, наадварот, адступіць на захад, бо, як мне сказаў на вуліцы днямі гродзенскі спадар з націскам, па складах: да Еўропы заўсёды лепей бліжэй, чым далей быць, бо Еўропа не Азія... Так, і на кожнага гуна знойдзецца варвар, ці гэта не з той оперы?

*Гродна*




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

ВЫРВАЛАСЯ



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Міністр Навумаў: Трэнерам мае быць спецыяліст, нават калі гэта негр

Галоўным трэнерам хакейнага клубу «Дынама» (Мінск) павінен быць спецыяліст высокага ўзроўню, заявіў журналістам 6 сакавіка ў Мінску старшыня Федэрацыі хакею, міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў.

«Няважна, айчынны гэта спецыяліст ці замежны. Няхай нават гэта будзе негр, калі ў яго ёсць высокая кваліфікацыя».

На Захадзе, дзе пільнуюць, каб ніхто нікога не зняважыў на расавай глебе, такое выказванне каштавала б міністру дорага. Але ў Беларусі чарнаскурых мала.

**Цытаты паводле БелаПАН**



Пры жыцці на Палякову не зважалі.

# 33-гадовая дысідэнтка з Салігорску зрабіла сабе смерць

**пасля таго як яе засудзілі на два з паловай гады «хіміі» па артыкуле «Лжывы данос».**

Раніцай 7 сакавіка зрабіла сабе смерць 33-гадовая салігорская праваабаронца Яня Палякова. Яе знайшлі павешанай у прахожай уласнай кватэры, дзе жанчына жыла з старэнькай маці, якой больш за 70 гадоў.

Што ж стала прычынай для такога кроку адчаю? Амаль усе сыходзяцца ў меркаванні, што жанчына не змагла змірыцца з нядаўнім прысудам.

За чатыры дні да трагедыі суд Салігорскага раёну вынес Паляковай прысуд паводле крымінальнай справы па артыкуле 400 частка 2 («Загадзя ілжывы данос»). У выглядзе пакарання жанчына атрымала два з паловай гады абмежавання волі («хіміі»), а таксама з яе спагналі адзін мільён маральнай кампенсацыі.

Гэтая справа пачалася яшчэ ў верасні летась, калі Палякова заявіла пра пераслед з боку праваахоўнікаў. У прыватнасці, яна гаварыла пра збіццё яе ўчастковым Пугачовым за тое, што яна збірала подпісы за Вольгу Казуліну падчас выбараў у парламент.

Суд скаргу Паляковай адхіліў. Затое на запатрабаванне Мінскай абласной пракуратуры (яе тады ўзначальваў арыштаваны Міхаіл Снягір) распачаў крымінальную справу ўжо супраць самой Яні. Відэаздымкі паказалі, што ў той вечар ніхто Паляковай не збіваў, і суддзя Бураўцоў вынес суровае пакаранне.



Несуцешнае гора маці.

Жыхарка Салігорску Ларыса Насановіч у сваім артыкуле, прысвечаным Паляковай, напісала: «У адміністрацыйных і крымінальных справах з палітычнай афарбоўкай да паказанняў міліцыі людзі ўжо даўно ставяцца скептычна. Як гаворыцца, аднойчы схлусіў, хто табе паверыць? А так як гэта «схлусіў» адчулі на сабе дастаткова шмат беларусаў, то выходзіць — ужо даўно не аднойчы».

Былы палітвязень і дэпутат Вярхоўнага Савету Валеры Шчукін прысутнічаў на гэтым судзе. «Для Яні гэты прысуд быў шокам. Я амаль цэлы дзень правёў у яе пасля гэтага суду, яна паўтарала адно: «Я не буду зэчкай», — кажа В.Шчукін.

Аднак з шэрагу розных прычын справа Паляковай аказалася на перыферыі грамадскай увагі. Праваабаронцы не прызналі справу палітычнай. Незалежныя СМІ скептычна ставіліся да скаргаў жанчыны, лічачы іх перабольшваннем. Можна толькі ўяўляць, як гэта ўсё перажывала сама Палякова.

А за дзень да суіцыду яшчэ кплівы артыкул пра Палякову надрукавала «Советская Белоруссия». Матэрыял падпісаны Ксенафонтам Суперфасфатавым, напісаны ў характэрнай фельетоннай стылістыцы. Напэўна, Яня не магла не заўважыць і яго.

Пра магчымасць самагубства Яня Палякова гаварыла знаёмым. Але не звярнулі ўвагі, не надалі яе словам важнасці. Толькі маці сцерагла начамі дачку, каб тая не зрабіла чаго непапраўнага. Але дзе тут упільнуеш.

Маючы вышэйшую эканамічную адукацыю, Яня Палякова амаль 10 гадоў не магла знайсці працы. У апазіцыйным асяродку Салігорску жанчына таксама не знаходзіла сабе месца. Салігорцы кажуць, што Яня была надзвычай эмацыйным чалавекам, мала з кім ужывалася. Усё ўспрымала блізка да сэрца. Вось і не вытрымала.

Пахавалі Яню Палякову 9 сакавіка ў Салігорску, пад бел-чырвона-белым сцягам.

Гэта ўжо не першы падобны выпадак. У снежні 2001 году зрабіў сабе смерць гомельскі актывіст «Зубру» Андрэй Зайцаў. На яго аказвалі псіхалагічны ціск супрацоўнікі КДБ, каб пачаў здаваць сваіх. Хлопцу нават удалося запісаць адну з размоваў з чэкістам, якую знайшлі побач з целам.

Тады за смерць Зайцава так ніхто і не адказаў.

**Зміцер Панкавец**





ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Смерць 33-гадовай жанчыны ўзрушыла людзей. На фота: як толькі стала вядома пра трагедыю, у сталіцы каля праваслаўнага сабору сабралася моладзь з партрэтамі дысідэнткі.

КАМЕНТАРЫ

## Угнаенні — на палі

Найперш была жорсткасць прысуду. Жанчыну, якая не была ніколі пад судом, асудзілі на 2,5 (!) гады абмежавання свабоды за паклёп на міліцыянта. Піша **Віталь Тарас**.

Самагубства лічыцца ў хрысціянстве найвялікшым грахом. Царква адмаўляе самагубцам у адпяванні. Але ніхто не забараняе праводзіць чалавека, які здзейсніў акт адчаю, у апошні шлях, ускласці кветкі да яго магілы, сказаць колькі словаў, памаліцца або проста памаўчаць. Адным словам, ніштo не замінае людзям паводзіць сябе па-чалавечаму.

У гісторыі самагубства праваабаронцы Яні Паляковай уражвае менавіта бесчалавечнасць, праяўленая да яе. Дзве рэчы не дазваляюць маўчаць.

Першая — жорсткасць прысуду. У выніку скаргі на супрацоўніка міліцыі жанчына, якая, наколькі вядома, не была ніколі пад судом, асуджаная на 2,5 (!) гады абмежавання свабоды за паклёп на міліцыянера. Пры гэтым аўтары шматлікіх ананімных скаргаў у розныя інстанцыі на дзеянні службовых асобаў розных узроўняў могуць спаць спакойна. Ім «хімія» за паклёп не пагражае.

І другая рэч. Галоўная газета РБ напярэдадні 8 Сакавіка падносіць жанчыне, так бы мовіць, падарунак у выглядзе фельетону, дзе яна выступае ў ролі сатырычнага персанажа. Увесь фельетон, ад назвы («Много у нас диковин, каждый чудак — Бетховен») да апошняга радка, напоўнены зняважлівай іроніяй і жоўцю. Зразумела, сатырычны жанр без іроніі — гэта нонсэнс. Але ў дадзеным выпадку усім адразу было ясна, што ахвяра сатыры — праваабаронца з Салігорску — нічым не можа адказаць на «ювеналавы стрэлы» сталічнай дзяржаўнай газеты.

Наўрад ці тут ёсць сэнс разглядаць змест фельетону. Але мае значэнне яго тон.

Квінтэсенцыяй цынізму можна лічыць подпіс — Ксенафонт Суперфасфатаў. Аўтар псеўданіму як бы намякае на Салігорск, дзе ўтвараюцца калійныя ўгнаенні. З другога боку, Ксенафонт, паводле Вікіпедыі, быў вучнем Сакрата, пісьменнікам, гісторыкам і вайсковым дзеячам. Во як! Не хухры-мухры.

А насамрэч, калі задумацца, фельетаніст міжволі распісваецца ў тым, што ён сам ацэньвае сябе ўнутры не вышэй за тое самае ўгнаенне. Ну, суперугнаенне...

Як пісалі раней раённыя выданні ў перадавіцах: «Угнаенні — на палі!».

Даўно няма КПСС. Але метады прапаганды ў адносінах да тых, хто не хоча «раззброіцца» перад уладай, скарыцца перад тупой сілай і гвалтам, засталіся.

Насенне, кінутае ў зямлю, рана ці позна ўзыдзе. Атрутны «суперфасфат» жа нічога не пакіне, акрамя шкодных нечыстотаў.

## Растаптаны гонар Яні Паляковай

Яня Палякова была эмацыйна няўстойлівым чалавекам. Чаму такога чалавека судзілі? Чаму такога чалавека цкавалі ў «СаўБеліі»?

Уся лукашэнкаўская сістэма палітычных рэпрэсій мае на мэце не фізічнае вынішчэнне апанентаў, а таптанне іх гонару. Збэшчаныя, яны будуць самі сабе агідныя і апусцяць рукі.

Суды за «лаяўся матам», за сімку ад мабільніка... Гэтая сістэма стала канвеерам, тысячы людзей праз яго прапусцілі.

Банальныя словы рэжуць нажом, калі чалавек сыходзіць, але тут не скажаш іначай: Палякова — ахвяра сістэмы. Такая ж ахвяра, як Карпенка ці Ганчар. Яна з таго ж пакутніцкага шэрагу, што і калгаснікі, якія співаюцца і лезуць у пятлю ад безвыходнасці, ад уласнай убогасці побач з мерсэдэсамі тых, каму на гэтым свеце добра жыць. Кожны з іх гіне па-свойму, але ўсе ад аднаго і таго ж. Ад растаптанасці на гэтым свеце, у гэткім укладзе.

Моцныя, як Аляксей Шыдлоўскі ці Эніра Браніцкая, выходзяць з судоў пераможцамі.

Палякова была зусім іншым чалавекам. Яна не вынесла сутыкнення з сістэмай.

Яе мала ведалі, яе мала слухалі, а яна таксама плакала за сваю Беларусь, як яна яе разумела, за сваё жыццё, як яна яго разумела.

І Беларусь плача сёння за 33-гадовую Яню Палякову, як за кожнага калгасніка плача, як за кожную безымянную магілку на бяскрайніх Паўночных могілках, як плача за свой растаптаны гонар. Там, дзе слёзы ўпадуць, там дубы прарастуць.

**Андрэй Дынько**

# Вялікая босая Сэзарыя Эвора



Сэзарыя Эвора будзе спяваць 21 сакавіка ў Палацы Рэспублікі.

**У Мінск прыязджае адна з самых геніяльных спявачак свету — афрыканка Сэзарыя Эвора. Яна выступае босая і не ведае ніякай мовы, апроч сваёй.**

Папяяць да нас едуць збольшага лонданскія starгпёры, якіх патрэба падахвоціла дастаць адну нагу з магілы ды выправіцца ў вандроўку, або фанерныя дзівы з першапрастольнай, у чыіх вачах адбіваецца пена з малахітавай джакузі.

І вось упершыню за колькі гадоў да нас прыбывае сапраўдная зорка. Да нас ляціць дзіва, каб у стылі «морна», афрыканскага блюзу, багатым, насычаным подыхам акіяну голасам падзяліцца пра сваю нібыта непрыкметную бацькаўшчыну, Каба-Вердэ, пра Выспы Зялёнага Мысу. Перакаўшы Еўропу і Амерыку, ляціць чула давесці і нам, што свет круціцца вакол партовага гарадка Міндэла, за пірсамі якога дыхае Атлантыка. 21 сакавіка на сцэне Палацу Рэспублікі выступіць Сэзарыя Эвора.

### «Выспы майго кахання»

Яе гісторыя мала нагадвае гісторыю Папялушкі, хаця б таму, што спадчынную галечу, уласныя заганныя звычкі і агульны ціск жыццёвай плыні яна канчаткова перамагла адно ў 50 гадоў. Яе гісторыя, яе зорны, праз церні, шлях — гэта хутчэй шлях краіны, якая ўпарта, нават больш за саму жанчыну, прагнула выгадаваць уласную прынцэсу. Сум па родных берагах, якія часцяком пакідаюць кабавердыйцы, хараство і ўбоства бацькаўшчыны, прыгонніцтва і каланіялізм, сляды якіх гэтак выразна адчуваюцца на выспах дасюль — усё ў кабавердыйскіх песнях. Другая Куба, жаданню яе жыхароў спяваць і дзяліцца пачуццямі не ў стане зашкодзіць ані галеча, ані захопнікі, ані камуністычны бот, ані праклён масавай іміграцыі.

Мяккі і суцяшальны, як калыханка, голас Сэзары далікатна лунае, ствараючы чароўны, гіпнатычны эфект. Быць на яе канцэрце і глядзець на людзей, якія, не разумеючы ні слова, ледзь стрымліваюць міжвольныя слёзы, калі яна на рэдкай мове крыулу, афрыканска-партугальскай трасянцы, цягне пра «выспы ветру, выспы майго кахання».

### Басаногая дзіва

Сэзарыя Эвора нарадзілася ў 1941 у Міндэле ў сям'і музыкі. Яшчэ падлеткам пачала спяваць морны мясцовага кампазітара Леза. Морна, кабавердыйская балада, сентыментальныя народныя матывы, поўныя жарсці і тугі, спалучаюцца з акустычным гучаннем гітары, скрыпкі, кларнету і акардэону. Спярша афрыканская морна мела бадзёры сатырычны рытм, але пад уплывам мяккай і меланхалічнай партугальскай музыкі фаду зрабілася мінорнай.

З цягам часу Сэзарыя робіцца паспяховай, наколькі можна быць папулярнай ў малюпацкай краіне з поўнай адсутнасцю шоу-бізнэсу. У 1975 Каба-Вердэ атрымала незалежнасць ад Партугаліі: каланізатары сышлі, але разам з імі знік і марскі гандаль, асноўная крыніца прыбытку тубыльцаў. Зарабіць песняй проста немагчыма — Сэзарыя змаўкае на доўгія 10 гадоў, падчас якіх у дадатак змагаецца з алкагалізмам. Але ў 1985 годзе сябры ўрэшце пераканалі яе пачаць кар'еру наноў — паехаць у Партугалію, каб запісацца там з іншымі кабавердыйскімі спевакамі.

Гэта быў першы раз, калі яна пакінула бацькаўшчыну. «Тое, што я пачала спяваць зноў, было сюрпрызам нават для мяне самой», — скажа яна потым. У 1988 выходзіць яе першы альбом «Басаногая Дзіва» — яна заўсёды, аж да сёння, выступае басанож. Яе першая шырокавядомая песня — Sodade. Песня, назва якой з партугальскае цудоўна перадаецца словам «смутак» (з усім яго спектрам пачуццяў ад настальгіі, тугі да засмучанасці і шкадавання) разнеслася па ўсёй Францыі, зрабіўшы яе стваральніцу шалёна папулярнай. У 1992 выйшлі альбомы «Спадарыня Парфумада» і «Сэзарыя», якія намінаваліся на «Грэмі». Сэзарыю пачынаюць запрашаць у іншыя краіны. Яна наведвае Іспанію, Партугалію, Канаду і Японію.

### Сэзарыя ў «Падполлі»

Эмір Кустурыца, які ў той час здымаў сваё «Падполле», запрасіў Сэзарыю заспяваць у фільме танга Ausencia. Сюжэт стужкі такі: у югаслаўскім сутарэнні трыццаць гадоў сядзіць партызан. Яго сябра па падполлі, які знаходзіцца на паверхні, запэўнівае яго, што краіна па-ранейшаму акупаваная немцамі і таму выходзіць навонкі небяспечна. Вядома, ніякай акупацыі даўно няма, проста сябар на паверхні не жадае, каб жонка, якая разрываецца паміж двума мужчынамі, абрала падпольшчыка. За ўсімі ўзвівамі сюжэту вымалёўваецца адвечная тэма: ён, яна і ён. Песня Сэзары, што лейтматывам гучыць на працягу ўсяго фільму, надае яму асаблівую жыццёвасць і глыбіню. Гэтак афрыканскі блюз быў дапасаваны да еўрапейскай драмы.

У 1999 Сэзарыя перазапісвае «Бэсамэ мучо». Здавалася б, бітая песня, але, дзякуючы Сэзарыі, яна зазіхацела новымі адценнямі. У 2004 спявачка атрымала «Грэмі» у намінацыі «музыка свету». У 2007 французскі прэзідэнт Жак Шырак уручыў спявачцы найвышэйшую ўзнагароду Францыі — медаль Ганаровага Легіёну за яе ўнёсак у культуру.

### Тытунь, трасянка, босыя ногі

Сэзарыя Эвора зрабілся сусветнай зоркай, але па-ранейшаму не вывучыла ніякай іншай мовы — яна ўсё спявае па-крэольску, смаліць як паравоз, ды як і на пачатку кар'еры не носіць абутку. Скажуць, «пільнуецца стылю». Пэўна, так. Яна мае шчасце трымацца свайго.

Фалькларысты сцвярджаюць, што жаночыя песні, поўныя тугі па родным краі, прапяяныя жанчынамі, якіх аддалі замуж далёка ад дому, складаюць традыцыю беларускіх народных песняў. Сярод тужлівых напеваў і жвавых мелодыяў беларусы абіраюць першыя. У справе выбару гімну больш людзей хілілася да «Паланэзу Агінскага», чым да бравурнага «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Паралелі?

У святле ўсяго напісанага вышэй, прыкладна так вось выглядае формула зорнага спеву: не вельмі шчаслівая бацькаўшчына, алкагольнае мінулае выканаўцы (націск усё ж на мінулае), да шчымення ў сэрцы замілаванасць родным парогам і, можа, дзеля кантрасту... шчопаць цёплага сонца.

**Павал Касцюкевіч**




**Рэспубліка Каба-Вердэ**

(таксама Выспы Зялёнага Мысу) — дзяржава на аднайменных выспах у Атлантычным акіяне (620 км ад заходняга ўзбярэжжа Афрыкі). Дзень незалежнасці: 5 ліпеня 1975 (ад Партугаліі). Афіцыйныя мовы партугальская, крыулу. Сталіца Прая (Praia). Форма кіравання – прэзідэнцкая рэспубліка. Тэрыторыя — 4033 кв. км (10 буйных і 8 малых астравоў). Насельніцтва — 542 000 чал. Валюта — эскуда Каба-Вердэ (CVE). 70% насельніцтва — крэолы, 28% — афрыканцы, 1% — еўрапейцы.

Тэрыторыя краіны ўзвышаная і даволі сухая. Рэльеф гарысты, з вялікай колькасцю патухлых і дзейных вулканаў. Клімат мяккі, сярэднегадавая тэмпература практычна не змяняецца (+ 25°С). Кожны востраў унікальны па прыродзе і ландшафце.

Асноўны від экспрату — прадукты мора, соль, скура, абутак і тэкстыль. Турызм — галоўны артыкул прыбытку краіны.

# Што за жанчына была з Лукашэнкам у аэрапорце?

У рэпартажы сербскага тэлеканалу выразна відаць нефармальна апранутая бландзінка, што выходзіць з машыны, у якой прыехаў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі ўвесь відэашэраг з А.Лукашэнкам старанна вывяраецца. У часе ж сербскага адпачынку, пасля таго як аб ягоным прыездзе стала вядома, кіраўнік Беларусі трапляў у аб'ектыў сербскіх — незалежных — СМІ. У прыватнасці, сербскія тэлеканалы асвятлялі адлёт кіраўніка Беларусі з сербскага курорту.

У аэрапорт А.Лукашэнка прыбыў у чорным лімузіне ў суправаджэнні мікрааўтобуса з ахovай. Ён быў апрануты неафіцыйна: без пінжака і гальштука. Побач з ім на заднім сядзенні аўто знаходзілася стройная бялявая жанчына ў кароткай куртцы з футраным капюшонам і модных высокіх ботах. Адзін ахоўнік адчыніў дзверы кіраўніку дзяржавы, другі — спадарожніцы. Яна выйшла з іншага боку машыны.

Каротка перамовіўшыся з ёй, Лукашэнка ў суправаджэнні аховы накіраваўся ў будынак аэрапорту. Хто тая жанчына? Хто, паводле дыпламатычных нормаў, можа займаць месца ў лімузіне побач з кіраўніком дзяржавы?

> Павел Лёгкі: «Мая вам парада: пакіньце гэтую тэму, бо вас чакае расчараванне».

«Калі Лукашэнку запрашаў у Сербію алігарх і візіт быў неафіцыйны, некарэктна ставіць пытанні па дыпламатычным пратаколе, — пракаментаваў былы пасол Беларусі ў Германіі Пётра Садоўскі. — Ён мае права садзіць каля сябе каго хоча. Тым больш, што кіраўнік дзяржавы сам прызнаў, што ездзіў не за бюджэтныя грошы, а за невядома якія. У Нямеччыне такое каштавала б палітыку пасады. Гэта ўвогуле немаведама што! Які тут пратакол!»

Па інфармацыю пра таямнічую спадарожніцу мы звярнуліся ў прэс-службу кіраўніка дзяржавы. «Мая вам парада: пакіньце гэтую тэму, бо вас чакае расчараванне: гэта чалавек, які не мае да сям'і кіраўніка дзяржавы ніякага дачынення, — адказаў на пытанне «НН» кіраўнік прэс-службы Павел Лёгкі. — Гэта чалавек, які адносіцца да суправаджальных асобаў, я так лічу. Але што гэта за чалавек, я, шчыра кажучы, не ведаю, бо не бачыў сюжэту. Я ведаю некалькіх людзей, якія маюць адносіны да кіраўніка дзяржавы, да забеспячэння яго дзейнасці — гэта і дактары, і людзі, якія займаюцца іншымі рэчамі з таго, што мы называем забеспячэннем...»

У паездцы кіраўніка дзяржавы суправаджала перакладчыца Алена Пілецкая, выпускніца славянскага аддзялення філфаку БДУ. Яна ёсць у сюжэце сербскага тэлебачання, прысвечаным развітальнай прэс-канферэнцыі А.Лукашэнкі ў аэрапорце. Але то дзяўчына з іншай прычоскай і ў іншым убранні. Ці магла гэта быць яна?

«Перакладчыкі часта суправаджаюць кіраўнікоў дзяржаваў нават у аўтамабілі, асабліва калі поруч знаходзіцца чалавек, які гаворыць на іншай мове. Нехта з прымаючага боку, — адказаў П.Лёгкі. — А я ведаю, што кіраўніка дзяржавы сустракаў мэр Ніша. Цалкам магчыма, што гэта была перакладчыца. Але паўтараю яшчэ раз: абсалютна ніякага дачынення да асабістага жыцця кіраўніка дзяржавы гэты чалавек не мае».

Хацелася б, аднак, менш таямнічасці вакол візітаў, працы і жыцця Аляксандра Лукашэнкі. Прынамсі, у еўрапейскіх краінах празрыстасць у дачыненні да найвышэйшых чыноўнікаў даўно стала нормай.

**Сяргей Мікулевіч**

Відэарэпартаж глядзіце на сайце nn.by.



Гэтая бландзінка выклікала ўсеагульную інтрыгу.



Да перакладчыцы не падобная.



У аэрапорце Лукашэнка з'явіўся перад фотакамерамі ў суправаджэнні сербскага бізнэсоўца Драгаміра Карыча. Быў разам з Аляксандрам Рыгоравічам у Сербіі і малы Коля.

## «Вы меня не предали — разочаровали»

Спявак **Вахтанг Кікабідзэ** выпусціў кліп на сваю песню-зварот да расійскай інтэлігенцыі.



Звяртаючыся да тых, хто яшчэ ўвесну называў яго сваім «другам», Кікабідзэ спявае па-расійску: «Вы меня не предали — разочаровали».

У кліпе выкарыстоўваюцца кадры з хронікі жнівеньскага канфлікту: расійскія самалёты бамбяць Грузію і Асецію. З імі чаргуюцца кадры культурнай хронікі СССР, дзе Міхаіл Дудзін, Бэла Ахмадуліна, Андрэй Вазнясенскі чытаюць свае вершы пра Грузію. Своеасаблівым эпіграфам кліпу служыць аўтограф Яўгена Еўтушэнкі «Про Грузию забыв неосторожно, поэтом быть в России невозможно».

Кікабідзэ адзначае: «Мы не хацелі рабіць кліп проста пра вайну, каб у людзей сэрца разрывалася... Гэтым кліпам мы нагадалі, што мы [з прадстаўнікамі расійскай інтэлігенцыі] былі сябрамі. Што яны да нас прыязджалі, мы ездзілі да іх...»

Нагадаем, што пасля жнівеньскай вайны Вахтанг Кікабідзэ адмовіўся прыняць з рук расійскага прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева расійскі Ордэн Сяброўства. Расійскія СМІ і некаторыя прадстаўнікі інтэлігенцыі пасля гэтага ў досыць жорсткай форме раскрытыкавалі ўчынак Кікабідзэ. Сам спявак адмяніў усе свае выступы на тэрыторыі РФ і пакуль не мае намеру выступаць у Расіі.

«Я і не спадзяваўся, што вы сапраўдныя сябры, — такую ідэю перадае песня, — але я думаў, што вы хоць людзі сумленныя і ўмееце адрозніваць праўду ад маны. Што ж... Вы меня не предали — разочаровали».

Песня не надрыўная, а задушэўная. Амаль універсальная песня пра сяброўства і здраду.

## СЦІСЛА

### Запрашаюць праграміста на 90 даляраў зарплаты

Бабруйскі гарвыканкам апублікаваў спіс вакансіяў у горадзе. У спісе размешчаныя 1632 прапановы для прадстаўнікоў розных прафесіяў, але зарплаты вельмі нізкія. Кіроўцаў спакушаюць працай за 250—370 тыс. рублёў. Раённы аддзел адукацыі шукае настаўніка нямецкай мовы за 300 тыс. рублёў. Урачу-педыятру прапаноўваюць 350 тыс. Дзе там да абвешчанай Белстатам сярэдняй зарплаты 919 тысячаў рублёў...

Вяршыняй можна лічыць прапанову прадпрыемства «БДТПТК»: яно шукае інжынера-праграміста на 254 тыс. Ці ж знойдзе і якое кваліфікацыі будзе той праграміст, калі добрыя спецыялісты з такой адукацыяй у суседніх краінах зарабляюць у дзесяткі разоў больш?

### У Польшчу на закупы: там усё таннейшае

Літоўскія турагенцтвы знайшлі залатую жылу, прапанаваўшы віленчукам паездкі на закупы ў Польшчу. Курс літа трымаецца, а злоты ўпаў, вось і адрадзіліся даўнія шоп-туры.

### Ахвяры галалёду

У Мінску за святочныя выхадныя праз галалёд атрымалі траўмы 129 чалавек. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя. 120 чалавек шпіталізаваныя, дзевяць атрымалі першую медыцынскую дапамогу на месцы. Галалёд быў незвычайны, а праз свята камунальнікі працавалі не ўсе.

**Паводле «Еўрарадыё», Westki.info, БелаПАН**

# Пенсіянерка села на лаву падсудных за апаганьванне магілы

**Незвычайны працэс завяршыўся днямі ў судзе Пастаўскага раёну.**

На лаву падсудных давялося сесці 58-гадовай жыхарцы вёскі Ярэва, якая ледзь не выкапала з зямлі труну з нябожчыцай.

Зусім не жартоўныя страсці разыграліся ў той халодны лістападаўскі дзень. Толькі паспела ад'ехаць з могілак пасля пахавання група родных, як на пагосце з'явілася раз'юшаная цётка Юзэфа, абураная тым, што на могілках занялі месца пахавання, якое яна абрала для сябе.

У шале жанчына раскідала вянкі і запаленыя свечкі, а потым на ровары прыехала скандаліць у хату памерлай на жалобны абед. Адтуль сын нябожчыцы выставіў няпрошаную госцю за дзверы, аднак яна і не думала супакоіцца. Наадварот, з лямантам пачала раскопваць магілу, але аднавяскоўцы не далі ажыццявіць гэту задуму.

Пасля заявы зняважаных родных памерлай у міліцыю была заведзена крымінальная справа. Праўда, да пазбаўлення волі справа не дайшла, але за апаганьванне могілак суд аштрафаваў пенсіянерку на 1 мільён 225 тысяч рублёў.

**westki.info, Паставы**

# Беларускі «Боінг» з пасажырамі выехаў за межы ўзлётнай паласы

**7 сакавіка ў маскоўскім аэрапорце «Дамадзедава» ў часе ўзлёту самалёт Boeing 737 авіякампаніі «Белавія» выкаціўся за межы ўзлётна-пасадачнай паласы.**

Паводле прадстаўніка «Белавіі», самалёт выпраўляўся ў рэйс В2 1955 «Масква—Мінск». Падчас разбегу самалёт стаў хіліцца ўлева, і камандзір экіпажу вырашыў спыніць узлёт. У выніку самалёт выкаціўся за межы паласы.

На борце знаходзіліся 48 пасажыраў і 5 членаў экіпажу. Ніхто з іх не пацярпеў. Пасажыраў адправілі ў Мінск іншым рэйсам «Белавіі» з аэрапорту «Шарамецьева» ў той жа дзень.

Самалёт адбуксіравалі на стаянку. Ніякіх бачных пашкоджанняў у яго не знайшлі. Расследаванне інцыдэнту вядзе адмысловая камісія, — удакладнілі ў прэсавай службе «Белавіі».

**Cz**

# Хлопец не вынес ганьбы

**Гісторыя, што летась пачалася як спартыўны анекдот, скончылася трагедыяй. «Бейсбаліст коштам 10 бітаў» скончыў жыццё самагубствам.**

26-гадовы пітчэр з амерыканскай каманды другой лігі «Ларэда Бронкас» Джон Адом не вытрымаў бясконцых жартаў у свой бок. Летась ён стаў вядомым не праз свае дасягненні, а праз дасціпны кантракт мэнэджэраў дзвюх камандаў — праз юрыдычныя акалічнасці быў немагчымы пераход Джона Адома з адной у другую каманду, таму ён быў фармальна абменены на 10 бейсбольных бітаў. Гэта было патрэбна, каб захаваць фармальны бок пераходу гульца, і ў аніякім разе дадзеная інфармацыя не павінна была трапляць на старонкі СМІ.



Але ж інфармацыя трапіла, і ўжо па прыезде на новае месца працы бейсбаліст атрымаў мянушку «Хлопец коштам 10 бітаў». Больш нікога не цікавілі ягоныя поспехі і паразы — яго толькі і пыталіся што пра тыя біты. Гледачы спявалі пра гэтыя біты песні, рабілі плакаты і г.д. Пашукавікі ў сеціве выдавалі на запыт «John Odom» звесткі пра гэтыя злашчасныя біты. І тады Адом вырашыў, што ён не варты такой увагі да сябе, і праз тры тыдні пасля той фатальнай угоды, сышоў з клубу, каб «выправіць сваё жыццё».

5 лістапада мінулага году ён быў знойдзены дома мёртвым. Ён атруціўся празмернай дозай наркатычных рэчываў і алкаголю. А тыя 10 кляновых бітаў, агульным коштам 665 даляраў, застануцца ляжаць на складзе.

**ДзДз**



# Эратычнае фота студэнткі Акадэміі міліцыі выклікала санкцыі

**У «Комсомольской правде» з'явілася фота студэнткі Акадэміі міліцыі ў негліжэ**

Газета надрукавала яго на апошняй старонцы: вось якія смелыя красуні ў нашай Акадэміі міліцыі. 22-гадовая Алена Шавель з Мінску навучаецца ў АМ завочна, на юрыстку.

Публікацыю заўважылі. Кіраўніцтва Акадэміі палічыла, што студэнткам не прыстойна пазаваць сябе ў такім выглядзе. Ад студэнткі запатрабавалі тлумачэння. Да выключэння справа не дайшла — студэнтка патлумачыла, што сама, маўляў, фота не дасылала, а даслаў нехта іншы, пажартаваў гэтак на 8 Сакавіка.

Мадэльку проста папрасілі надалей «не ганьбіць гонар беларускай міліцыі».

**МБ; ДГ**

БРЭНДЫ-ЛЕГЕНДЫ

# Камп'ютэр у яблыкі

**25 гадоў таму кампанія «Эпл» выпусціла персанальны камп'ютэр «Макінтош», які першы выкарыстоўваў звыклы сёння графічны інтэрфэйс (вокны, значкі, меню на экране) ды мыш. Але не менш вядомым зрабіўся і сімвал фірмы — надкушаны яблык.**

Першы лагатып «Эпл» быў зроблены ў 1976 заснавальнікамі фірмы Стывам Джобсам і Рональдам Вэйнам і суправаджаў першы ж прадукт фірмы — камп'ютэр «Эпл-1». Тое быў, мякка кажучы, змястоўны таварны знак. На ім быў выяўлены матэматык і фізік Ісаак Ньютан, які сядзеў пад яблыняй, з галіны якой звісаў абкружаны німбам яблык, што меўся ашчасліць начынне чарапной каробкі навукоўца. Праз год заснавальнікі памянялі той забагаты лагатып на прасцейшую выяву — надкушаны яблык, пафарбаваны ў колеры вясёлкі.

У 1988 афарбоўка лагатыпу памянялася: цяпер яблык быў вытрыманы ў чырвоных колерах. А ў 1998 чырвоны перайначыўся ў радыкальны чорны. Неўзабаве дадалася срэбраная мадыфікацыя, якую можна сустрэць на вечках-маніторах эплаўскіх ноўтбукаў.

З цягам часу абрыс яблычка зрабіўся адным з самых пазнавальных у папулярнай культуры. Першай, хто прыклаўся да іміджу «Эпла», была акторка кіно Сара Джэсіка Паркер, што грала панадную журналістку Кэры Брэндшоў у вядомым серыяле «Сэкс у вялікім горадзе».

Паводле сцэнару Кэры вядзе ў газеце калонку на тэму адносінаў паміж мужчынамі і жанчынамі. Тэксты Кэры набірае на пераносным камп'ютэры, вечка якога ўпрыгожвае яблык. З цягам серый робіцца ясна, што галоўная гераіня любіць не толькі шматлікіх мужчынаў — журналістка таксама мае пэўнае замілаванне да свайго пераноснага сябра. З ім яна і дзеліцца ўражаннямі, і раіцца пра любоўныя закалоты.

Кіраўнікі фірмы «Эпл» з гэтай нагоды вырашылі ўдасканаліць выяву, перакуліўшы яе дагары нагамі. Цяпер яблык і назва фірмы зрабіліся зразумелымі для тых, хто глядзіць на адваротны бок адкрытага вечка.

Надкушаны яблык пачаў з'яўляцца на графіці, насценных малюнках, а на вуліцах сёння можна сустрэць людзей, на чыіх передплеччах красуецца вытатуяваны плод. Але ў справе ўвекавечвання брэнду ўсіх выперадзіў адзін японскі фермер, які наклейвае на яшчэ няспелыя яблыкі адмысловую налепку. Тую налепку ён здымае восенню, і тады на жарай паверхні спелай садавіны можна ўбачыць пазнавальны зеленаваты абрыс.

Тут ужо не вытрымала і контр-культура. Цяпер нароўні з адметнай жоўтай літарай «М» (таварны знак «Макдоналдса») ды іншымі лёгка пазнавальнымі лагатыпамі сусветных карпарацыяў надкушаны яблык упрыгожвае пратэставыя плакаты антыглабалістаў і зялёных.

**ЛК**

# Без шуму і пылу

**У Бабруйску пахавалі злодзея ў законе Уладзіміра Бірукова. Праваахоўнікі да апошняга не верылі, што смерць гэтага крымінальнага аўтарытэта — не інсцэніроўка.**




Пахаванне злодзея ў законе Уладзіміра Бірукова, што адбылося 5 сакавіка ў Бабруйску, прайшло без інцыдэнтаў. Супрацоўнікі міліцыі назіралі за падзеямі на адлегласці.

Жалобная працэсія рухалася, трымаючыся правілаў дарожнага руху. У ёй пераважалі нятанныя машыны з нумарамі Магілёўскай вобласці, але было і некалькі машын расійскай «прапіскі». Праўда, паводле інфармацыі СМІ, вярхі расійскага крымінальнага свету на пахаванне не паехалі: развіталіся з «Бірам» у Маскве.

Бірукова пахавалі на Мінскіх могілках Бабруйску побач з бацькам і іншымі сваякамі.

Гэты выхадзец з Бабруйску, вядомы ў крымінальным свеце пад мянушкамі «Бірук» або «Біра», быў найбагацейшым беларусам, які меў «тытул» злодзея ў законе. Ён быў бы багацеем і без крыміналу: бацька пакінуў яму ў спадчыну маёмасць і немалыя сумы грошай на банкаўскіх рахунках у Ізраілі. Але Бірукоў вырашыў зарабляць незаконным шляхам. У пачатку 1990-х ён стаў завадатарам рэкецірскіх груповак, якія збіралі даніну не толькі з камерцыйных, але і з дзяржаўных прадпрыемстваў. У канцы 1990-х «Біру» было прад'яўлена абвінавачанне ў вымантачванні і махлярстве. Ён уцёк у Расію і жывым у Беларусь ужо не вярнуўся. Некаторыя яго калегі ў тыя часы папросту прапалі ў Беларусі, як злодзей у законе Шчаўлік, пра знікненне якога раз абмовіўся быў кіраўнік дзяржавы.



Вянок «ад братвы».

Бірукоў жа ў 2001-м стаў грамадзянінам РФ, і на яе тэрыторыі вёў выключна законапаслухмяны лад жыцця. Яго і не выдалі ў 2003-м беларускім праваахоўным органам, бо «не здзяйсняў злачынстваў на тэрыторыі Расіі».

Але ў Бабруйску Бірукоў працягваў «працаваць па спецыяльнасці». Праз падстаўных асобаў ён скупаў нерухомасць і здаваў яе ў арэнду, пускаючы грошы ў незаконны абарот. Тых «падстаўных» летась судзілі.




Пахавальны эскорт з нятанных аўто.

Сам Бірукоў па падазрэнні ў арганізацыі незаконнай скупкі нерухомасці быў абвешчаны беларускімі праваахоўнымі органамі ў міжнародны вышук. 19 лютага 2009 г. яго затрымалі ў Маскве, але на наступны дзень адпусцілі, бо ў расійскага боку прэтэнзій да яго не было. А праз некалькі дзён, 28 лютага, Бірукоў памёр у Маскве ад вострай сардэчнай недастатковасці.

Цела Бірукова было дастаўлена на радзіму вечарам 3 сакавіка. Пахаванне планавалася на 4 сакавіка. Паводле адной з версій, прычынамі пераносу стала правядзенне экспертыз, якія пацвердзілі, што памерлы — сапраўды Уладзімір Бірукоў. Бо праваахоўнікі да апошняга не верылі, што гэта не чарговы хітрыкі злодзея ў законе.

**Паводле naviny.by**

## СЦІСЛА

### Ізноў згарэла царква ў в. Каралёў Стан

У ноч з 6 на 7 сакавіка ў в. Каралёў Стан недалёка ад Мінску па Маскоўскай шашы згарэў дашчэнту прыходскі дом, у якім таксама знаходзілася і храмавае памяшканне Крыжаўзвіжанскага прыходу.

Нагадаем, што менавіта ў гэтай вёсцы 21 студзеня 2002 г. малалетнія сатаністы падпалілі храм у гонар Крыжаўздзвіжання, які згарэў дашчэнту. Новы настаяцель прыходу а. Аляксандр Гарбуноў пачаў узнаўленне храму, дзякуючы намаганням прыходу ўдалося збудаваць прыходскі дом і практычна завяршыць і будаўніцтва храму.

Імаверна, што прычынай узгарання стаў падпал.

### Абгарэлы ў Слоніме салдат пражыў яшчэ два тыдні

4 сакавіка ў 432-м Галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных сіл у Мінску памёр адзін з трох ваенных службоўцаў, пацярпелых ад пажару ў Парку 11-й асобнай механізаванай брыгады ў Слоніме (Гродзенская вобласць) 19 лютага. Атрыманыя траўмы аказаліся несумяшчальнымі з жыццём. Нагадаем, 19 лютага падчас планавых заняткаў па баявой падрыхтоўцы аднаго з падраздзяленняў брыгады адбылося ўзгаранне паліва ў танку Т-72. Члены экіпажу — тры ваенныя службоўцы, якія былі шпіталізаваныя. Па факце ўзгарання вядзецца следства.

### Скраў манекен

У краму «Паравіны году» ў Баранавічах ускочыў невядомы, схапіў манекен, апрануты ў світэр і куртку, ды збег з ім. Злодзей выяўлены, і цяпер яго шукаюць.

### У Нямеччыне затрымалі двух беларусаў

Крымінальная паліцыя нямецкага гораду Хемніц затрымала двух беларусаў 23-х і 39-ці гадоў. У часе праверкі іх «Мерсэдэсу» памежнікі — горад знаходзіцца непадалёк ад мяжы з Чэхіяй — звярнулі ўвагу на тое, што на многіх скураных рэчах, якія былі знойдзеныя ў багажніку, на гандлёвых этыкетках прысутнічала маркіроўка супраць крадзяжу, якая ў часе пакупкі тавару здымаецца. Таксама ў часе праверкі сярод рэчаў былі знойдзеныя інструкцыі па нейтралізацыі сістэмаў супраць крадзяжу. Прыблізны кошт скрадзеных рэчаў — 4 тысячы еўра. Дагэтуль застаецца нявысветленым, дзе маглі быць скрадзеныя тавары.

### Забойцам падпальшчыка пагражае смяротнае пакаранне

6 сакавіка завершана следства па крымінальнай справе ў дачыненні да чатырох жыхароў вёскі Пухавічы Жыткавіцкага раёну, якія абвінавачваюцца ў жорсткім забойстве аднавяскоўца-падпальшчыка. Падазраваныя былі затрыманыя 10 студзеня і змешчаныя ў ізалятар, аднак 6 лютага, пасля ўмяшання прэзідэнта краіны, мера стрымання была зменена на хатні арышт. Цяпер ім прад'яўлена абвінавачанне ў забойстве ў адпаведнасці з ч. 2 арт. 139 Крымінальнага кодэксу, што караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 8 да 25 гадоў, або пажыццёвым зняволеннем, або смяротным пакараннем.

### Справа Снегіра

Расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да былога пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра павінна завяршыцца ў сакавіку—красавіку сёлета. 12 снежня 2008 году былому пракурору Мінскай вобласці было прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 424 Крымінальнага кодэксу («Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі»). Ён быў узяты пад варту. Цяпер праводзіцца экспертыза на прадмет вызначэння кошту будаўнічых матэрыялаў, выкарыстаных пры пабудове катэджу.

**СМ; паводле БелаПАН, «Звязда», радыё «Свабода», churchby.info**



PHOTO BYMEDIA.NET

**Мінская Опера адчыняе свае дзверы пасля капітальнага рамонту, які цягнуўся тры доўгія гады. Акрамя паднаўлення інтэр'еру і механізацыі сцэны, ля фасаду будынку былі ўсталяваныя скульптуры муз, а на порціку — скульптуры німфаў і апекуна музыкі, бога Апалона. Затое помнік Максіму Багдановічу, які займаў цэнтральную алею, перамясцілі ў менш бачнае месца.**
**Ужо ў красавіку Опера запрацуе напоўніцу: спярша балетныя пастаноўкі, і неўзабаве — оперныя. А 14 і 27 сакавіка (Міжнародны дзень тэатраў) з нагоды адкрыцця там адбудуцца святочныя гала-канцэрты.**

**ЛК**

# Сярога: мяне памылкова лічаць расійскім



3 сакавіка ў мінскай кавярні UPTEKA адбылася цырымонія ўзнагароджвання лідэраў продажаў сеткі музычных крамаў «Містэрыя гуку». У 2008 г. айчынныя артысты выпусцілі больш за 60 дыскаў. На першых месцах — рэпер Сярога (дыск «Хроника парнишки с гомельских улиц»), гурт J:морс («Адлегласць») і «Ляпіс Трубяцкой» («Капитал»). «Нейра Дзюбель» з альбомам Stasi на 9-м месцы, «Крамбамбуля» (The Best Albo Belarusian Disco) — на 10-м.

Прэтэндэнтам на першае месца, безумоўна, быў альбом «Манифест» гурту «Ляпіс Трубяцкой», але выкладанне дыску для свабоднага спампоўвання ў інтэрнэце пазбавіла яго большай часткі першапачатковых продажаў.

Гвозд вечару — рэпер Сярога — гаварыў шмат: «Мне вельмі прыемна, што мяне палічылі беларускім артыстам, таму што многія памылкова лічаць мяне музыкам расійскага шоу-бізнэсу. Я ў Гомелі натыкнуўся на такі надпіс, які мне вельмі спадабаўся: «Купляйце беларускае!» Няхай гэта будзе маім лозунгам!»

**Аляксандра Рогач**

## СЦІСЛА

### Будаўнікі фінансуюць помнік дойліду Івану

знакамітаму аўтару Спаса-Праабражэнскага храму Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра ў Полацку. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца прафесійныя скульптары. Новы помнік збіраюцца ўсталяваць у жніўні і прымеркаваць гэту падзею да прафесійнага свята будаўнікоў.

### Крызіс дайшоў да Шагала

Вядомы оперны тэатр ЗША Metropolitan Opera заклаў два гіганцкія пано Марка Шагала, якія ўпрыгожваюць фае будынку. Прычына — няпросты фінансавы стан. Фонд Metropolitan Opera ва ўмовах фінансавага крызісу рэзка скараціўся праз змяншэнне ахвяраванняў і падзенне кошту акцый. Пано «Трыумф музыкі» і «Вытокі музыкі» памерам 9,1 на 11 метраў, створаныя Шагалам для Оперы ў сярэдзіне 1960-х, застануцца ў фае будынку.



**Фрагмент карціны «Трыумф музыкі».**

### Выйшла кніга пра Юльяна Нямцэвіча

У Брэсцкай абласной бібліятэцы 3 сакавіка адбылася прэзентацыя кнігі Анатоля Гладышчука «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі». Гістарычна-дакументальны нарыс прысвечаны роду Юльяна Урсына Нямцэвіча (1758—1841) — пісьменніка і палітыка, паплечніка Тадэвуша Касцюшкі. Аўтар кнігі — Анатоль Гладышчук, загадчык кафедры фізікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэту. Кніга выдадзена пры фінансавай падтрымцы аблвыканкаму.

### Памёр Лявон Мурашка

У ноч на 9 сакавіка памёр вядомы оперны спявак Лявон Мурашка. Ён амаль сорак гадоў быў салістам Літоўскай Оперы і аб'ездзіў з канцэртамі паўсвету. Апошнія гады быў рэгентам архіерэйскага хору Свята-Духава манастыра ў Вільні, кіраваў Згуртаваннем беларускіх грамадскіх суполак Літвы. Браў удзел у з'ездах беларусаў свету. Яму было 84 гады. Пахавалі Лявона Мурашку на Еўфрасіннеўскіх могілках Вільні.

**АГ, Cz, Народныя навіны Віцебску, БелаПАН**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Шапран С. Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах/Сяргей Шапран.** — Мінск — Горадня, 2009. — 734 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны. Гарадзенская Бібліятэка. Людзі Беларусі)

Журналіст Сяргей Шапран выдаў грунтоўную кнігу «Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах». Гэта звод публікацый, рукапісаў, лістоў Быкава, да Быкава, пра Быкава, вакол Быкава. Там можна пабачыць невядомыя архіўныя дакументы датычныя пісьменніка, яго рэдкія фотаздымкі. Гэтая кніга — першая спроба стварыць своеасаблівую энцыклапедыю Васіля Быкава.

**Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет. Курс лекцый / Захар Шыбека.** — Вільня: ЕГУ, 2009. — 372 с.

Выйшла кніга лекцый Захара Шыбекі «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет». Гісторыя гарадоў паказаная храналагічна, паралельна і параўнальна, праблемы сучаснасці Беларусі — з рэтраспекцыямі ў мінулае і ў кантэксце сусветных працэсаў. Аўтар разглядае такія аспекты, як ментальнасць гараджанаў, гарадскі камфорт, гарадское самакіраванне і горадабудаўнічая палітыка. Выданне прыдатнае для выкарыстання ў якасці дапаможніка па спецкурсе «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет» (сёння выкладаецца ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце). Кніга будзе цікавая і карысная шырокаму колу чытачоў.

**«Дзеяслоў» №1 (38)**/студзень–люты/— Мінск, 2009

У «Дзеяслове» №1(38)'09 — новыя вершы Генадзя Бураўкіна і Уладзіміра Арлова, апавяданне Сяргея Дубаўца «Кайлюс і Зелба», гістарычная аповесць Кастуся Тарасава «На вайне», пераклад старажытнаанглійскай паэмы «Бэўвульф», зроблены Антонам Францішкам Брылём, дзённікі Міхала Дубянецкага.

**СМ**

# Спадарыня Лета

**З Сібіры вярнулася яна ў Беларусь. Цяпер гэтую мініяцюрную мінчанку ў вышываным адзенні і карункавай палярыне ў твар ведаюць тысячы людзей. Хоць яна не з тых, каго паказваюць па тэлебачанні.**



Юлія Дарашкевіч

**Лета, восень, зіма... Ці жыццё цячэ так хутка для ўсіх, ці толькі для мяне? Стаіш, як на пагорку, паміж маці і дачкой, паміж бацькам і сынам, і ўглядаешся ў неба, і ідзеш за сонцам... А сёння вечны калаўрот супыніўся: у «НН» у гасцях спадарыня Лета. Завітала ў «НН» Лета. Так усе называюць гэтую чароўную жанчыну. Яна вельмі маладая: тварам, душой, вопраткай сваёй цудоўнай. Значкам з «Пагоняй», зялёнай шапачкай, карункавай палярынай на плячах. Карэнная мінчанка і беларуска. Сяброўка БНФ. Спадарыня Лілета Юстыновіч — спадарыня Лецейка.**

— Ой, гэта такая неспадзеўка... Для «Нашай Нівы» гутарка?.. Кажаце, у мяне незвычайнае жыццё дый нават імя — Лілета... Нарадзілася я тут, у Мінску, у 1939 годзе. Імя мне даў татка. Ён загінуў на пачатку 1940-га на фінскім фронце. У мяне аскепачкі ўспамінаў...

Мама была настаўніца, а тата — інжынер з першага выпуску Політэхнічнага інстытуту, будаўнік — светлы рай ім абаім. Да адпраўкі на фронт ён працаваў пяць гадоў у Мінску, не было ніводнага выхаднога... Але яго на лінію Манергейма кінулі... 12 сакавіка... 12 сакавіка ён загінуў, нам абвестка прыйшла...

Мама расказвала, што жылі мы на Койданаўскім тракце — цяпер гэта вуліца Чкалава — у старым дзедаўскім доме, і не было чым паліць грубкі, то маці з бабуляй секлі старыя венскія крэслы... Аднойчы бацька прыйшоў на абед разам з прарабам з будоўлі, і прараб, бачачы гэта, без ведама бацькі распарадзіўся прывезці нам воз нейкіх абрэзкаў на дровы. То бацька так сварыўся тады, такія вымовы даваў маці: «Як ты магла, ты ж ведаеш, якая цяжкая абстаноўка, цяпер усе так жывуць, як ты магла ўзяць гэтыя дровы!»

Бацька не быў партыйным, але шчыра верыў у ідэал. Як і многія з тых, хто ў 1937-м стаяў на краі гэтай ямы Курапацкай, шчыра верыў у савецкую ўладу. У бацькі быў малодшы брат, Стась, дык вось ён, як я цяпер гэта разумею, якраз быў у супраціве савецкай уладзе, і бацька яго яшчэ ўшчуваў: «Як цябе зямля савецкая носіць!»

Некаторыя бацькавы лісты з фінскай вайны захаваліся: «Клавачка, я не разумею, чаму нам кожны дзень даюць гарэлку? Марозу ж няма».

Па прафесіі я інжынер. Не прынесла мне гэтая прафесія задавальнення. Але мама мне раіла так далікатна, не настойваючы: вось татка быў інжынерам, добра б, каб і ты... То я і скончыла Політэхнічны інстытут па спецыяльнасці кераміка. Мне гэтыя шкробы, чарапы і падабаюцца, але ж займацца прыйшлося больш цэглай... Божа, Божа, так і праскочыла жыццё, так хутка, так імгненна, без следу, і адзінае, што мяне трымае на плыву: удзячна лёсу, Богу перадусім, што я паспела яшчэ ускочыць у гэты цягнік часу. Нягледзячы ні на што. Час наш цудоўны! Я аптыміст. Калі мы дасёння не зніклі, то застанемся, пакуль зямля ёсць... Я спасцігаю гэта цяпер, хаця, можа, мне гэта і ненадоўга спатрэбіцца.

Пасля інстытуту я паехала ў Брацк, працавала там пяць гадоў. Многа мне дала гэтая работа: сяброў адусюль, вялікую бібліятэку — бо там грошай плацілі няблага, то я выдаткоўвала іх на кнігі. Я везла вялікі кантэйнер з Сібіры сюды. А за апошнія гады я раздала бібліятэку сябрам: я ўсё гэта ўжо прачытала, хай цяпер, можа, людзі хто прыкладзецца да гэтага таксама. Так і цяпер: што купляю з кніжак, то раздаю моладзі па прачытанні.

Адным словам, я ўжо рыхтуюся да непазбежнага шляху. Спакойна гляджу на гэта. Пра адно малю Бога: каб даў час ведаць загадзя, час на пакаянне... Мяне хрысцілі пры немцах, таму ў мяне сваё стаўленне да акупацыі, як і ў многіх людзей.

Ведаеце, калі мне было дваццаць адзін, я ехала праз Сібір, з акна цягніка бачыла ўсе гэтыя бясконцыя драўляныя астрогі, то віхура пытанняў мучыла. Гэты неспакой, гэтыя пытанні, гэтыя няпэўнасць — яны чакалі свайго часу. Таму ў 1989-м, калі пачалося Адраджэнне, я кінулася ў яго з галавой. Гэтыя дваццаць гадоў ім і жыву.

Мы, тыя, што без бацькоў раслі, разумелі, што гэта ненармальна, ненатуральна. У Мінску, у цэнтральных школах, мы вучыліся побач з дзецьмі партыйных вялікіх начальнікаў. У гэтых дзяцей былі бацькі, яны атрымлівалі кватэры, вялікія, з выгодамі. А сем'і карэнных мінчукоў доўга жылі нават у зямлянках. Таня Зычук, Лёня Карповіч, светлы рай яму... Настаўніца ўсё пыталася: чаму ў цябе, Лёня, плямы тлустыя на сшытку? А яны жылі бедна-бедна, мусіць, на адным століку і елі, і пісалі... Такія, як мы, усё імкнуліся зашыцца, затаіцца. Цяпер я думаю, што гэта такая была характэрная беларуская рыса.

Мы былі боўдзіламі — я асабіста пра сябе — у школьныя гады, усё было запраграмавана... Мы хадзілі шыхтамі, як салдаты: у культпаход у кіно, на суботнік, на дэманстрацыю. Нам давалі гэтыя партрэты на шчоглах, пасля дэманстрацыі мы іх адзін аднаму спіхвалі, не ведалі, куды падзець. Зусім не так цяпер: калі нясеш наш сцяг у Курапаты дзесяць кіламетраў і нехта з ветлівасці прапануе дапамагчы, заўсёды адказваеш: не, дзякуй, ад гэтага рукі не баляць...

Маці на ўсё была здольная, сама ўсё рабіла, а я не, а я не. І дачка мая, дзяўчына мая такая. У 1990-м яна пераехала на Валожыншчыну, у Лоск, ужо пабраўшыся, з маленькай дачкой сваёй. Цяпер трое дзяцей у яе. Яна там жыве і ў Мінск нават не прыязджае. Яна адвучылася ва ўніверсітэце нашым два гады, на біяфаку, і кінула — бо не яе гэта было. А цяпер яна пасвіць статак у Лоску...

Яна заўсёды была вельмі самастойнай. Так і ў школе, і з адукацыяй, і з мужам сваім сама ўсё вырашала. І печ сама сабе складзе, і абкосіць, і забаранue. А школку ў Лоску зачынілі ў тым годзе. І музей Сымона Буднага, адзіны, мусіць, у Беларусі, што быў пры школе, зачыніўся. Унукі мае туды хадзілі. А Верачка, старэйшая, так добра паступіла ў коледж, вучыцца цяпер на дызайнера тут у Мінску.

А я хачу скончыць жыццё ў Лоску — наша гэта зямелька, віленская, напалову бліжэй да Вільні.

Мама ўсё жыццё шкадавала, што мы не пераехалі ў Вільню...

А яшчэ мама любіла тэатр. І я таксама. Ён быў мне выратаваннем ад усяго крывога і злыдушнага. Галубок [адзін з бацькоў-заснавальнікаў сучаснага беларускага тэатру, забіты саветамі — **Рэд.**] у мамінай школе драматычны гурток вёў.

З тэатрам у нашай сям'і многа звязана... Бацькава сястра адна, Гэля Маеўская — светлы рай ёй! — была другой жонкай Фларыяна Ждановіча [слынны актор тэатру імя Янкі Купалы. — **Рэд.**]. Ждановіч быў такі вельмі донжуаністы. А Гэля была прыгожая-прыгожая. І вось Ждановіч на час пакінуў сям'ю, у якой ужо была маленькая Ірына, потым славутая артыстка — не так даўно памерла, — і пайшоў да нашай Гэлі... Ох, яна таксама пахавана на гэтых Вайсковых кладах, каля самай царквы, трэба мне ёй шыльдачку паправіць, як сцяплее. Дык вось, яе радзіна была строга такая каталіцкая, і яна пасля гэтага адвярнулася ад Гэлі. А Ждановіч потым усё ж такі ацверазеў і яе кінуў. Ёй тады было 25 гадоў. І Гелена застрэлілася. Гелена Ждановіч, так і на шыльдачцы старой напісана...

Толькі ў тэатры я і бачыла сапраўдныя пачуцці... За сценамі тэатру людзі іграюць, часта кепска, цынічна. У жыцці прыходзіш, каб верыць. А яно, бывае...

А ў тэатры я знаходзіла прытулак, прыстанак. Глядзела спектаклі, вяла дзённікі. Адзін і той жа спектакль магла глядзець процьму разоў, бо кожны раз гэта быў новы спектакль! Але тэатр быў мне патрэбны толькі тады, у тыя гады, калі рэальнае жыццё было такім фальшывым. Усё змянілася ў 1988 годзе.

Я перанесла страшныя сухоты, у мяне распадаліся лёгкія. Бог схацеў, каб я выкараскалася.

І вось Дзяды 1988-га. Перадаць уражанне немагчыма. Жыццё сапраўднае пачалося з гэтага. Публікацыі, сустрэчы, сябры-аднадумцы сталі заводзіцца. Якія аўдыторыі збіраў тады Пазняк! Якія масы людзей. Ад маці яго ў яго гэтыя рысы лідэра, гэты аскетызм. У яе, спадарыні Ганны, у вачах — мужнасць і мудрасць.

І як адрэзала ў мяне з тэатрам. Прапала патрэба. У мяне з'явілася замена. Бо чалавек не можа жыць без падпарадкавання ўсяго сябе нейкай галоўнай ідэі, патрэбе. Мы такіх словаў не ўжывалі ніколі, але гэта так. У каго гэта матэрыяльная патрэба: дня не пройдзе, каб не забег у краму, проста так, абы зайсці. У каго патрэба чытаць. Вось Ядзя Пятроўская — вы яе ведаеце? — яна ходзіць на тры імпрэзы ў дзень! Дзе што адбываецца — яна там. Потым ганіць мяне: чаго ты не прыйшла туды і туды? І я ёй адказваю: дык я яшчэ не пераварыла таго, што было тры дні да таго! Я пераварваю павольна...

Я жыла па жарсцях, па пачуццях — але не зусім бяздумна. Крытычных дурнотаў не было. Наканаванасць нейкая мяне вяла. І з замужжам так адбылося: я выйшла замуж у 28 гадоў за былога аднакласніка, не з вялікіх пачуццяў, не з роспачы. Вось менавіта нейкае наканаванне.

Вялікае каханне было ў мяне таксама — з 10 гадоў... І гэты чалавек зрабіў мне прапанову ў 2006 годзе, ужо незадоўга да смерці... І я сказала тады: а дзе ж ты быў 50 гадоў таму? Гэта было патаемнае, чыста маё каханне...

А сухоты мае скончыліся тым, што здароўе сабе я вярнула. А спадара свайго страціла... Пакуль я была ў лякарні год, ён вельмі сышоўся з маёй сяброўкай. Мы ніколі не сварыліся, не ганілі адзін аднаго... Так выйшла. Напісаў цыдулку: «Лета, дай пісьмовую згоду на развод»... Спакойна я цяпер пра гэта расказваю, а тады... Пачуцці тыя словамі не перадаць.

...Бог не можа дапусціць, каб чалавек назапашваў веды і розум, і раптам гэта абрывалася... Сочыш за сабой, каб зусім не ператварыцца ў пытальнік. Вы гэтага пакуль не разумееце.

Я хачу паслужыць. Паслужыць сітуацыі. Чым? Я заўсёды кажу сяброўкам: мы можам гаварыць з людзьмі. Мы можам дзяцей глядзець: я вось глядзела сыночка Піта Паўлава, Яна Вінцэнта. І сваіх унукаў у мяне трое.

Я ўвесь час думаю: чаму пасля пад'ёму пачатку 1990-х настаў такі спад адраджэнскага руху? Калі ў 1999 годзе быў раскол Фронту, мы былі ў шоку, у роспачы! Зараз, калі пачынаеш шукаць, то відна вельмі ясправа, адкуль ногі растуць! Але я цвёрда ведаю, што Пазняк вернецца, і вернецца з трыумфам, так, як вярнуўся ў свой час у Чэхію Ян Масарык.

**Запісала**
**Наталка Бабіна**

# Два праваслаўі

Некалькі стагоддзяў беларуска–ўкраінскае праваслаўе развівалася асобна ад расійскага. Піша **Алег Дзярновіч**.

Апошнія падзеі ў Расійскай праваслаўнай царкве зноў узнялі пытанні што да яе гісторыі і статусу. Царкоўныя іерархі не рызыкнулі прапанаваць на патрыярха ўкраінскага мітрапаліта, і гэта выклікае здзіўленне — праваслаўных прыходаў ва Украіне рэальна больш, чым ва ўсёй Расіі. Гістарычным жа цэнтрам праваслаўя на Русі сапраўды ёсць Кіеў.

## Царква ў Вялікім Княстве Літоўскім

Ахрышчаныя ў канцы X ст. усходнееўрапейскія тэрыторыі ўваходзілі ў склад Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі, якая ў царкоўнакананічных адносінах падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярху.

У Вялікім Княстве з 1316 г. узнікла незалежная Літоўская мітраполія — такая яе назва вядомая паводле візантыйскіх грэцкамоўных крыніцаў. Кафедра Літоўскай мітраполіі дзейнічала ў Навагрудку, вядомым сваімі царкоўнымі традыцыямі, праваслаўнымі храмамі і мностваам вернікаў. Літоўская мітраполія ахоплівала землі Наваградскай (з намесніцтвам у Вільні), Полацкай і Тураўскай епархіяў — такім чынам, усю Беларусь.

Але канстанцінопальскія патрыярхі, якія не жадалі канчатковага падзелу Праваслаўнай Царквы Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага, прызначалі мітрапалітаў у Навагрудак нерэгулярна, нягледзячы на просьбы вялікіх князёў літоўскіх. Патрыярхі, як правіла, вельмі негатыўна ставіліся да ўсіх спробаў падзелу «Кіеўскай правінцыі», слушна ацэньваючы іх як умяшанне свецкай улады, пагрозу грэка-візантыйскім духоўным, царкоўным і палітычным уплывам, прыбыткам і манапольнаму панаванню на Русі.

Фактычна, усё XIV і першыя два дзесяцігоддзі XV ст. паміж Вільняй і Масквой працягвалася суперніцтва за Кіеўскую мітраполію. Абедзве кафедры мітрапалітаў былі залежныя ад свецкіх уладаў, а маскоўская — яшчэ і ад ардынскай.

У 1415 г. з ініцыятывы вялікага князя Вітаўта Царкоўны сабор у Навагрудку абвясціў незалежнасць Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ ад мітраполіі ў Маскве. Пасля нашэсця нагайскага хана Эдыгея на Кіеў мітрапаліт Цамблак перанёс кафедру з Навагрудка ў Вільню. Але канчатковы падзел адбыўся ў 1458 г., узніклі дзве незалежныя мітраполіі — Кіеўская, з цэнтрам у Навагрудку, і Маскоўская, якая менавіта так стала называцца ад 1459 г. У 1472 г. мітрапаліт Праваслаўнай Царквы ВКЛ Рыгор Баўтарын атрымаў кананічнае прызнанне Канстанцінопальскага патрыярха.

## Маскоўскі патрыярхат

Маскоўскія ўладары дамагліся зацвярджэння патрыяршаства ў канцы XVI ст. Калі Сусветны патрыярх (а гэты тытул мае патрыярх Канстанцінопальскі) Ерамія II у чэрвені 1588 г. прыбыў у Маскву, распачаліся складаныя перамовы з Крамлём. Патрыярх апынуўся фактычна пад хатнім арыштам сваіх адзінаверцаў. У маі 1589 г. Ерамія II выдаў акт прызнання за мітрапалітам маскоўскім Іовам патрыяршаства. Маскоўскае патрыяршаства было пацверджанае Саборам у Канстанцінопалі 1590 г., пра што ў Маскву былі высланыя адпаведныя граматы. Значная роля ў гэтым поспеху Крамлю належала Барысу Гадунову, які фактычна кіраваў Маскоўскай дзяржаваю ад імя цара Фёдара Іаанавіча.

Аднаасобныя дзеянні Канстанцінопальскага патрыярха выклікалі супярэчлівую рэакцыю на праваслаўным Усходзе. Традыцыяналісты выступалі супраць парушэння канону. Як паказалі графалагічныя даследаванні канца XX ст., значная колькасць подпісаў іерархаў на зацвярджальнай грамаце 1590 г. была падробленая — са 105 подпісаў удзельнікаў Сабору не менш за 70 — несапраўдныя. Толькі ў 1593 г. Масква дамаглася згоды на Вялікім Царкоўным Саборы ў Канстанцінопалі — усе 42 подпісы на адпаведным акце аўтэнтычныя.

Усталяванне патрыяршаства, як ні парадаксальна, не толькі ўмацавала аўтарытэт маскоўскай Царквы, але і ўводзіла ўладу расійскіх манархаў над ёй — паводле «Палажэння аб патрыяршастве», самі патрыярхі, а таксама мітрапаліты, архіепіскапы і епіскапы ў абавязковым парадку мусілі зацвярджацца царом.

## Сінадальнае праваслаўе

Але ўмяшанне свецкай улады ў жыццё Праваслаўнай Царквы ў Расіі зусім не абмяжоўвалася толькі актам стварэння. Калі ў 1700 г. памёр патрыярх Адрыян, то Пётр I забараніў абіраць яму пераемніка. Расійскаму манарху, захопленаму ідэямі пераўтварэння і абсалютнай улады, былі непатрэбныя ніякія аўтаномныя структуры ў ягонай новай Расіі. У 1721 г. патрыяршаства было ўвогуле ліквідаванае, а для кіравання Царквой быў створаны асобны дзяржаўны орган — Сінод, альбо Духоўная калегія. Галавою гэтай новай установы прызначаўся свецкі чыноўнік — Обер-пракурор. Місія кіравання Царквой ускладалася на службоўца, адказнага толькі перад імператарам. Царкоўная рэформа азначала ліквідацыю самастойнай грамадскай ролі Царквы, якая пераўтваралася ў складовую частку чыноўна-бюракратычнага апарату абсалютысцкай дзяржавы.

Цяпер зразумела, чаму ўлады Рэчы Паспалітай так негатыўна ставіліся да імкнення расійскай Царквы падпарадкаваць сабе праваслаўных у Вялікім Княстве і Кароне. Гэта справядліва разглядалася як памнажэнне расійскай экспансіі. У сваю чаргу расійскія ўлады паспяхова выкарыстоўвалі тэзіс пра парушэнні рэлігійнай свабоды ў Рэчы Паспалітай. Усё ж спробы падтрымаць праваслаўе, незалежнае ад Расіі, рабіліся. Тут вялікая надзея ўскладалася на скліканую ў 1791 г. Пінскую кангрэгацыю, якая абвясціла аўтаномнасць Праваслаўнай Царквы Рэчы Паспалітай. Праваслаўныя РП цяпер прызнавалі верхавенства толькі Канстанцінопальскага патрыярха. Сойм падтрымаў гэтае рашэнне і абяцаў заступніцтва. Часу ж для рэформаў, як бачым, засталося зусім мала.

Але і ў Расіі рэлігійныя інтэлектуалы ацэньвалі Сінадальны перыяд як час дэградацыі Царквы. Мікалай Бярдзяеў сваё эсэ так і назваў — «Гасільнікі духу»: «Сінадальная царква, у якой не жыве дух, толькі і ведае, што патрабуе зајўды і ва ўсім ціхмянасці і пакорлівасці. Яна баіцца духоўнага жыцця як агню ды шукае спосабы затушыць агонь Духу».



Рыгор Цамблак (1364—1419/20) быў абраны мітрапалітам пры падтрымцы Вітаўта. Прыжыццёвая выява.

## Аднаўленне

Аднаўленне патрыяршаства ў Расіі адбылося толькі ў 1917 г. Падчас паседжанняў Усерасійскага Памеснага Сабору далёка не ўсе ўдзельнікі выказваліся за рэстаўрацыю. Але тут прыйшла навіна пра захоп бальшавікамі ўлады, і 28 кастрычніка Сабор абвясціў пра адраджэнне ў расійскай Царкве патрыяршаства. Новы патрыярх Ціхан у кастрычніку 1918 г. звярнуўся да Савету Народных Камісараў: «Усе, хто ўзяў меч, ад мяча і загінуць. Гэтае прароцтва Збаўцы звяртаем Мы вам, цяперашнім вяршыцелям лёсу нашай айчыны, якія называюць сябе «народнымі» камісарамі. Цэлы год вы трымаеце ў руках сваіх дзяржаўную ўладу і ўжо збіраецеся святкаваць гадавіну кастрычніцкай рэвалюцыі, але рэкамі праліта крывё братоў нашых, бязлітасна забітых паводле вашага закліку, звяртаецца да неба і прымушае Нас сказаць вам горкае слова праўды».

Распачаўся пераслед патрыярха. Непасрэдна ад расстрэлу яго ўратавала нота ўраду Вялікабрытаніі 1923 г., вядомая як «нота Керзана». Лондан пагражаў поўным разрывам стасункаў і патрабаваў, у тым ліку, спыніць рэпрэсіі супраць Царквы. Затое савецкія ўлады ўзялі курс на раскол Царквы, а пасля смерці Ціхана ў 1925 г. не давалі дазволу на абранне новага патрыярха.

Да гэтага царкоўнага інстытуту звярнуўся ўжо Сталін, які пасля бясслаўных паразаў 1941 г. шукаў іншыя магчымасці абудзіць энтузіязм сваіх падданых. 4 верасня 1943 г. адбылася сустрэча савецкага дыктатара з мітрапалітам Сергіем і яшчэ двума іерархамі. На гэтай сустрэчы прысутнічаў таксама палкоўнік бяспекі Карпаў — будучы старшыня Рады па справах РПЦ. Мітрапаліты на прапанову Сталіна выклалі свае пажаданні, у тым ліку — правядзенне Сабору і абранне патрыярха. Сталін заявіў, што ўрад СССР будзе ўсяляк судзейнічаць. У тым жа месяцы мітрапаліт Сергій стаў патрыярхам. Менавіта ад гэтага палітычнага акту вядзе свой рэальны радавод сённяшняя Маскоўская патрыярхія.

Гісторыкі Царквы адзначаюць, што мітрапаліт Сергій з траўня 1927 г. стаў на шлях безумоўнай лаяльнасці палітычнаму рэжыму СССР, што выклікала супярэчлівыя рэакцыі Царквы як у СССР, так і за яго межамі. У дзейнасці патрыярха Сергія свецкія гісторыкі адзначаюць важны факт — падчас вайны праваслаўнае духавенства пад ягоным кіраўніцтвам актыўна дапамагала абароне дзяржавы, умацоўваючы патрыятычны дух расійцаў, а таксама матэрыяльна дапамагаючы фронту.

Кожны можа сам судзіць, наколькі сённяшняя Маскоўская патрыярхія працягвае старажытную Кіеўскую традыцыю — пасля разрыву з праваслаўнымі ў Вялікім Княстве Літоўскім, пасля двух стагоддзяў Сінадальнага перыяду, пасля сталінскай рэстаўрацыі. Але феномен рэлігійнасці значыць, што для сапраўднага верніка пытанні кананічнасці царкоўнай юрысдыкцыі не галоўнае. Усё ж гэтае пытанне вельмі важнае для саміх царкоўных іерархаў.



Патрыярх Ціхан (1865—1925) у студзені 1918 г. выдаў знакамітую «Адозву», дзе было сказана: «Апамятайцеся, шаленцы, спыніце вашыя крывавыя расправы. Бо тое, што вы робіце, не толькі жорсткая справа, гэта сапраўды справа сатанінская».



Царква Св. Барыса і Глеба ў Навагрудку — мітрапаліцкая саборная царква Літоўскай мітраполіі.

## КАНЦЭРТЫ

**Рок-каранацыя**

**14 сакавіка а 18-й у Палацы культуры Маладзечна (пл.Цэнтральная, 4)** — «Рок-каранацыя-2008»

**GARADzKIJA і Бан-Жвірба**

**19 сакавіка ў Гомельскім ГЦК (Ірынінская, 16)** зайграюць гурты GARADzKIJA і «Бан-Жвірба». **Пачатак а 19-й**

**Neuro Dubel**

**12 сакавіка а 19-й у мінскім клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16)** выступае Neuro Dubel. Замова месцаў і дадатковая інфармацыя: (029) 179-99-18, (029) 779-99-18

**Разбітае сэрца пацана**

**16 сакавіка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — «Разбітае сэрца пацана». **Пачатак а 19-й.**

**Pomidor/OFF**

**17 сакавіка ў «Графіці»** — акустычны канцэрт Pomidor/OFF. **Пачатак а 19-й**

**Канцэрт у Доме Ваньковічаў**

**15 сакавіка а 16-й у Доме Ваньковічаў (Інтэрнацыянальная, 33а)** адбудзецца канцэрт класічнай вакальнай музыкі. Спявае Алена Кананчук (сапрана), канцэртмайстар Тацціяна Рыдлеўская.

## ІМПРЭЗЫ

**Францыя ў сэрцы Беларусі**

**16 сакавіка а 18-й у Доме Дружбы (Захарава, 28)** — літаратурна-музычная імпрэза «Францыя ў сэрцы Беларусі». У праграме: творы беларускіх літаратараў, натхнёных Францыяй і французскай культурай, пераклады, французскі танец, французскія і беларускія песні ў перакладзе, выстава коміксаў і многае іншае. Вечарына пройдзе на двух мовах — беларускай і французскай.

**Сустрэча з Якавенкам і Бураўкіным**

**17 сакавіка на ТБМ** адбудзецца сустрэча з пісьменнікам, аўтарам трылогіі «Пакутны век» Васілём Якавенкам. У сустрэчы возьмуць удзел крытык Аляксей Рагуля, мастак Алесь Цыркуноў, паэт Генадзь Бураўкін. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**Лекцыя пра Язэпа Драздовіча**

Лекцыя мастака, эсэіста, супрацоўніка музею-заказніку «Заслаўе» Юрася Малаша пад назвай «Зямля і космас Язэпа Драздовіча» адбудзецца **18 сакавіка ў гімназіі г.Заслаўе а 14-й.**

**Прэзентацыя новых гістарычных кніг у ЕГУ**

**16 сакавіка а 13-й у аўдыторыі 009 навучальнага корпусу Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту (Вільня, вул.Валакупю, 5)** адбудзецца прэзентацыя кніг: «Гісторыя Беларусі найноўшага часу ў дакументах і матэрыялах» (укладальнік Юры Бачышча) і «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет» аўтарства Захара Шыбекі.

## ВЫСТАВЫ

**Кветкавы рай III**

**У галерэі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 16 красавіка** працуе выстава «Кветкавы рай III».

**Некласічны бестыярый**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 15 сакавіка** працуе выстава твораў Маргарыты Сташулёнак «Некласічны бестыярый».

**Ctrl + Art**

**У Палацы мастацтваў да 15 сакавіка** працуе выстава «Ctrl + Art». «Ctrl + Art» — гэта спроба паказаць магчымасці сінтэзу творчых канцэпцыяў і тэхналогіі іх рэалізацыі.

**Жыццё Айчыне, гонар нікому**

**У Нацыянальнай бібліятэцы да 23 сакавіка** працуе выстава «Жыццё Айчыне, гонар нікому», прысвечаная 180-годдзю з дня нараджэння славутага калекцыянера і грамадскага дзеяча графа Эмерыка фон Гутан-Чапскага.

**Чароўныя лялькі**

**У Доме-музеі І з'езду РСДРП (пр.Незалежнасці, 31а) да 4 траўня** працуе выстава «Чароўныя лялькі».

**Дзікія кветкі вясны**

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (М.Багдановіча, 7а) да 20 сакавіка** працуе выстава лялек украінскай мастачкі Аксаны Цюпы «Дзіўныя кветкі вясны».

**Велікодная пісанка**

**Музей народнага беларускага мастацтва ў Раўбічах** запрашае на майстар-клас «Велікодная пісанка». **Заняткі ладзяцца ў суботы (14, 21, 28 сакавіка і 4, 5 красавіка) а 13-й.**

**Abstract-2009**

**У Палацы мастацтваў (Казлова, 3) да 15 сакавіка** працуе выстава Abstract-2009, прысвечаная 90-годдзю Віцебскай мастацкай школы.

## ТЭАТРЫ

**12сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»
**Купалаўскі тэатр** — «Дамскае танга» (Малая сцэна)
**Тэатр лялек** — «Балада пра Белую Вішню»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр Горкага** — «Перад заходам сонца»

**13сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладына»
**Балет** — «Спячая прыгажуня»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

**14 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** —«Адэль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжу»
**Тэатр імя Горкага** — Царэўна-жабка»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладына»
**Тэатр юнага гледача** — «Якая стварыла цуд»

**15 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Балет** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**16 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Эмігранты»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»

**17 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»
**Купалаўскі тэатр** — «Паланчанка»
**Балет** — «Эсмеральда»

**18 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Купалаўскі тэатр** — «Востраў Сахалін» (Малая сцэна)
**Тэатр юнага гледача** — «Мятлік»
**Балет** — «Спартак»

**19 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (інтымны дзённік)»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**20 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр розыгрыш»
**Купалаўскі тэатр** — «Тапалевая завея»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзікае паляванне карля Стаха» (Малая сцэна)
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**21 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Тэатр юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаунтлерой»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**22 сакавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
Балет — «Рамэа і Джульета»
**Тэатр імя Горкага** — «Нібыта хворы»



# Вечарына памяці Валянціна Тараса

**Яна пройдзе 20 сакавіка у мемарыяльнай зале Дома літаратара (вул.Фрунзе, 5, уваход ад вул.Румянцава). Пачатак у 18.30.**



# «L.»

**19 сакавіка ў Вялікай залі Філармоніі а 19-й** пачнецца канцэрт французскай спявачкі «L.». «L.» — маладая французская артыстка, аўтарка, кампазітарка і выканаўца. Яна выконвае шансон — увага, французскі! — з элементамі року, хіп-хопу, электроннай музыкі.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Комікс пра пяты тэрмін прэзідэнцтва

**Захавальнікі** (Watchmen)

ЗША — Вялікабрытанія — Канада, 2009, каляровы, 163 хв.

**Рэжысёр:** Зэк Снайдэр

**Жанр:** Комікс-антыўтопія паводле графічных навэлаў Алана Мура і Дэйва Гібанса

**Адзнака:** 6 (з 10)




Альтэрнатыўны 1985 год. Савецкі Саюз бразгае зброяй, у Злучаных Штатах — дыктатура ўсенароднаабранага прэзідэнта Ніксана, які пайшоў ажно на пяты тэрмін. Свет наканадні ядзернай катастрофы.

Нікому не патрэбныя былыя супергероі вядуць жыццё абывателяў. Але хутка яны разумеюць, што на іх абвешчанае негалоснае паляванне...

Карціна Зэка Снайдэра, які паставіў комікс «300 спартанцаў» — адзін з самых дзіўных фільмаў апошніх часоў. Амерыканскія коміксы, казкі цэментных гарадоў — з яскравымі маскамі, акрэсленымі нягоднікамі і станоўчымі героямі — даўно ўжо пнуліся выйсці за межы фантазійнае тэрыторыі. У казачных герояў з'яўляліся фрэйдысцкія комплексы («Бэтмэн»), яны вучыліся тэрарызму і дэмагогіі («Цёмны рыцар»), вялі змрочныя дзённікі «Гораду грахоў».

Стужка Снайдэра прэтэндуе на статус антыўтопіі — з жорсткай сацыяльнай крытыкай. Антываенныя дэманстрацыі расстраляныя, гратэскавая купка палітыканаў вырашае лёс планеты; ракеты чакаюць запуску. А самі супергероі — гэтыя вітрыны амерыканскай мары — забіваюць дзяцей і цяжарных, атлусцелі і пакутуюць на імпатэнцыю, як Бэтмэн, ці, увогуле, псіхапаты, як Роршах.

Альтэрнатыўны 1985 год са сваёй прыдуманай гісторыяй выглядае стылёва-змрочнай рэальнасцю. Гэта выбуховая, як ядзерная бомба, стужка — пляма распаду старых эпасаў ці пазнака новага — які толькі ствараецца.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 16—22 сакавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 16 сакавіка, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял, 17 серыя
**19.00** «1945: год, які змяніў свет» (1945: The Year that Changed the World), дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 4
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.35** «Еўрасаюз без сакрэтаў», 2 серыя
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Без рэтушы»: «Афганец», дак. фільм, 2009 г., Польшча
*«Споемте-ка, друзья, как жили мы в Афгане, как горы в нас стреляли, ты вспомни-ка, браток». Такія песенькі цяпер спяваюць зоркі беларускай поп-сцэны. Вайна ў Афганістане ператвараецца ў адзін з міфаў пра салдацкае братэрства. Яшчэ нядаўна гэтая вайна лічылася сорамам народу, улады нават не маглі патлумачыць неабходнасць умяшання ў справы іншай дзяржавы. Была таксама горыч ад цынкавых трунаў, што вярталіся з гэтай экзатычнай краіны. Рост наркаманіі, некалькі тысячаў маладых людзей з фізічнымі і псіхічнымі траўмамі — гэта таксама «афганскі след».*
*Сёлета — 20-я гадавіна вываду савецкіх войскаў з Афганістану. Як жывецца ветэранам той вайны сёння? Ці не прачынаюцца начамі ў нямым крыку, ці не маюць праблемаў з сацыялізацыяй у грамадстве? І ці гэтае грамадства рупіцца пра іх у выпадку інваліднасці? Ці варта ім ганарыцца сваімі подзвігамі? А мо ёсць што хаваць у сваёй памяці? І што яны думаюць пра тое, што «іхнюю» вайну скарыстоўвае ў сваіх мэтах афіцыйная прапаганда?*
**21.45** «Мяне завуць Бах», маст. фільм, рэж. Дамінік дэ Рыва, 2003 г., Нямеччына—Швейцарыя.
**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 2 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 17 сакавіка, аўторак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 2 серыя
**18.55** «Ад-магілы-да-магілы», маст. фільм, рэж. Ян Цвіткавіч, 2005 г., Славенія.
**20.40** Рэальная гаспадарка (эканамічная праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Семя», дак. фільм, рэж. Войцех Каспэрскі, 2005 г., Польшча
*Сібір, Алтай, невялікая вёска ў канцы дарогі ў Алтайскія горы. За імі — Казахстан. У вёсцы жыве сям’я з сямі чалавек, выключаная з вясковай грамады. Ім ніхто не дапамагае, не падае рукі. Чаму? Сям’я хавае таямніцы мінулага.*
**21.50** Форум (ток-шоу): Каму служыць беларускі чыноўнік?
**22.35** «Соня і яе сям’я», дак. фільм, рэж. Даніела Руснакава, 2006 г., Славакія
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 3 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 18 сакавіка, серада

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 3 серыя
**18.55** Беларусы ў Польшчы
**19.10** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.25** «Нетрываласць. Адзін дзень у свеце Далай Ламы», дак. фільм, 2005 г., Італія
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**21.45** Госць «Белсату»: Алег Алкаеў
**22.00** «Сон-трава», канцэрт гурту «Тройца», ч. 2
**22.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 19 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 19 сакавіка, чацвер

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.15** «Мент», дэтэктыўны серыял, 19 серыя
**19.05** Кружэлка (сусветная музыка)
**19.40** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Трысняговы танец», дак. фільм, рэж. Анджэй Фідык, 2000 г., Польшча
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Без рэтушы»: «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча
**22.15** Інтэрнаўты выбіраюць
**23.15** «Мент», дэтэктыўны серыял, 20 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 20 сакавіка, пятніца

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.15** «Мент», дэтэктыўны серыял, 20 серыя
**19.00** Хто ёсць кім?: Валянціна і Валянцін Нагорныя
**19.20** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.55** «Невядомая Беларусь»: «Сабачая будка», дак. фільм, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2009 г., Польшча
**20.25** Кухня (музычная праграма)
**20.45** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы.
**21.30** «Лепей быць прыгожай і багатай», камедыя, рэж. Філіп Баён, 1993 г., Польшча
**23.05** «На поўных абаротах», серыял, рэж. Лешэк Васевіч, 2005 г., Польшча, 1 серыя.
*Восеньскі Сопат, сезон скончыўся, ля пірсу ўсё яшчэ стаіць прышвартаваны карабель «Ястраб», у якім месціцца шынок. Трымае яго Вінцэнт Ястраб. За караблём пільна сочыць паліцыя, бо мае інфармацыю, што там сустракаюцца крымінальныя асобы. Шынок на вадзе — таксама улюбёнае месца двух былых марскіх афіцэраў, якія страцілі працу і нават сэнс жыцця тры гады таму ў выніку марской катастрофы... Маракі рыхтуюцца да тэстаў, пасля якіх змогуць вярнуцца на флот. Але іх чакае вір неспадзяванак і суровых выпрабаванняў.*
**23.30** «Стараабрадцы, якія адыходзяць», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**00.00** Аб’ектыў (навіны)




### 21 сакавіка, субота

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Пень поўны волава», дак. фільм, рэж. Бранка Шміт, 2007 г., Харватыя
*Фільм распавядае пра цяжкасці сацыялізацыі харвацкіх ветэранаў балканскай вайны 1990-х. У цэнтры стужкі — гісторыя 35-гадовага чалавека, які мае жонку і трох дзяцей. Ён прайшоў усю вайну, а цяпер беспрацоўны, мае сям’ю, спрабуе жыць як усе... Гэты фільм — ягоная споведзь.*
**19.10** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.35** «Журналісты», дак. фільм, 2007 г., Польшча
**20.25** Падземка (беларускі хіт-парад)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (праваная праграма)
**21.30** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Таксі-4», маст. фільм, рэж. П’ер Марэль, 2007 г., ЗША.
*Злачынцу № 1 перавозяць з Бельгіі ў Конга праз Марсэль. Аднак небяспечнаму злачынцу ўдаецца збегчы... Марсэльскай паліцыі зноў не абысціся без дапамогі Данэля і яго рэактыўнага таксі.*
**23.30** «Прывід з Давыд-Гарадка, дак. фільм, 2008 г., Польшча
*Сучасны беларускі горад. Сярод шэрага натоўпу раптам з’яўляецца дзяўчына ў нацыянальным строі: доўгая спадніца, кашуля, кабат і незвычайны галаўны ўбор — намітка. Але на дзяўчыну мінакі не звяртаюць увагі. Мо таму, што ейны строй вельмі адрозніваецца ад таго, што прывыклі бачыць беларусы на розных афіцыйных «Дажынках» і плакатах «За Беларусь». Для пераважнай большасці намітка не асацыюецца з беларускім народным адзеннем... Чаму ж старажытны беларускі галаўны ўбор знік з нашай памяці? Каб пабачыць сапраўдную намітку, варта з’ездзіць у палескае мястэчка Давыд-Гарадок.*
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 22 сакавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.20** «Ранча», серыял, 18 серыя
**19.10** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю» на Замкавым пляцы ў Варшаве. Выступ гурту «IQ48».
**19.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 5
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Форум (ток-шоу): Чаму маладыя людзі эмігруюць?
**22.05** «Беспрацоўныя панядзелкі», маст. фільм, рэж. Фэрнанда Леон дэ Араноа, 2002 г., Іспанія.
*Гэта — сацыяльнае кіно: пра сум, настальгію, адчай і адначасова пра сяброўства ды пяшчоту ў чалавечых адносінах, дзе ёсць месца і з’едлівай іроніі — у час, калі трэба выжываць. Некалькі сяброў з астурыйскага гораду Хіхон страцілі працу на карабельні. Ім застаецца толькі збірацца ў маленькім бары, каб паразважаць, пасміяцца і пасумаваць, спрабуючы знайсці выйсце з жыццёвай нявыкруткі.*
**00.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)



## Збяры Кнігарню «Наша Ніва»



















ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ

ПЕРЛЫ

# Не судзі!

З судовых пратаколаў.

**Суддзя:** «Якая была адлегласць паміж дзвюма машынамі падчас іх сутыкнення?»

***

**Суддзя:** Такім чынам, Вы былі там, пакуль не сышлі адтуль?

***

**Адвакат:** Вы пражылі ў гэтым горадзе ўсё сваё жыццё?

**Сведка:** Пакуль яшчэ не.

***

**Адвакат:** Ці ёсць у Вас дзеці ці нехта такога штталту?

***

**Суддзя:** Вы можаце апісаць таго чалавека?

**Сведка:** Сярэдняга веку, з барадой.

**Суддзя:** Мужчына ці жанчына?

***

**Суддзя:** Што перапыніла Ваш першы шлюб?

**Сведка:** Смерць.

**Суддзя:** Смерць каго з пары перапыніла яго?

**Сабраў ЛК**

# 8 мільёнаў еўра за Аляксандра Глеба



Мюнхенская «Баварыя» прапануе 8 млн еўра за паўабаронцу зборнай Беларусі Аляксандра Глеба, які так і не здолеў нармальна згуляць у каталонскім клубе.

Нямецкі гранд хоча знайсці замену вінгеру Франку Рыберы, якога наўрад ці ўдасца ўтрымаць у Мюнхене.

Глеб перайшоў у «Барсу» ўлетку з лонданскага «Арсеналу» за 15 млн еўра, у якім ён быў ключавым гульцом. У складзе «каналіраў» Глеб правёў тры сезоны. Да гэтага, у 2001—2005 гадах, ён гуляў за нямецкі «Штутгарт».

Усяго ў складзе «Барселоны» А.Глеб згуляў 24 матчы, але толькі 13 — у іспанскім чэмпіянаце (роўна палову матчаў клубу). З іх 5 разоў выходзіў у стартавым складзе), таксама 4 матчы згуляў Глеб у Лізе чэмпіёнаў, 7 — у Кубку Іспаніі).

У сераду «Барселона» гуляе матч у адказ 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў з французскім «Ліёнам». У Ліёне каманды згулялі ўнічыю — 1:1.

**АГ**




**Змычка гораду і вёскі. Міністры сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра (злева) і адукацыі — Аляксандр Радзькоў.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**КВАТЭРА**

**Здам** 2–пакаёвую кватэру на працяглы тэрмін. Т.: (029)757–94–07

**ПРАЦА**

**Выпускнік БДУ (радыёфізіка (КБ)** шукае працу з магчымасцю далейшага размеркавання. Ведаю C++, асэмблер, маю досвед праграмавання DSP. Англійская на ўзроўні чытання тэхлітаратуры, базавыя польская, іспанская. Лёгка навучаюся. Т.: (029) 501–17–89 (Яўген), jauhienas@gmail.com

**Патрэбныя** 2 педагогі для працы ў дзіцячай беларускамоўнай групе 3–4 гадоў у дзіцячым садку ў мікрараёне Сухарава. Дад. інфармацыя праз тэл. (029)395–73–99

**КНІГІ**

**Сябры!** Пабачыў свет новы энцыклапедычны даведнік Леаніда Маракова «Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансекраваныя і свецкія асобы Беларусі. 1917—1964», у якім згадана больш за 2500 святароў і каля 900 касцёлаў. Каб набыць гэтае ўнікальнае выданне, вам трэба патэлефанаваць: (029)753–82–12, (044)722–07–71

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Антон Астаповіч 15 сакавіка запрашае** ў краязнаўчую вандроўку «Астравецкі рэквіем»: Жодзішкі — Гервяты — Міхалішкі — Тракенікі — Быстрыца — Варняны — Астравец — Гудагай. Т.: (029)111–73–32, (017)262–73–43

**Запрашаем у падарожжы «Замкі Беларусі» 22 сакавіка (нядзеля)** па маршруце: Мінск — Мір — Навагрудак — Любча — Шчорсы — Ліда — Іўе — Мінск. 29 сакавіка (нядзеля): Беніца — Крэва — Баруны — Гальшаны — Вішнева — Дзесятнікі — Валожын. Т.: (029)622–57–20; (029)509–12–16; (029)110–19–28; 292–54–58

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Мінску** інжынер Цывінскі апрацаваў праект, каб збудаваць мост праз Садовай вуліцы, а другі ад Семінарыі на Татарскую Слабаду, ды каб скасаваць Плябанскія млыны, і гэтым забяспечыць жыхароў ад залівання паводкай. «Даклад» зрабіў інжынер яшчэ ў 1906 г, усё каштаваць мае 12 тысячаў рублёў, — а карысць вялікая. Але грошай няма!

**«Наша Ніва». №10. 1909**

## УДАКЛАДНЕННЕ

Аўтарам песні «Бывайце здаровы...» быў не Алесь Рыбак, як напісана ў артыкуле «Беларус паедзе на «Еўрабачанне» ад Нарвегіі» («НН» № 8’2009), а, вядома, Адам Русак. Перапрашаем.



# Набудзь беларускую кнігу

«Кнігарня Логвінаў» **у галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасці, 43)** прапануе сваім чытачам **кожны чацвер з 18.00 да 19.00** купіць кнігу з рук сапраўднага беларускага літаратара. Прыходзь, каб атрымаць аўтарытэтную параду, аўтограф, проста паглядзець.

**12 сакавіка** — у «Падземцы» Артур Клінаў.

**19 сакавіка** — Уладзімір Арлоў.

**26 сакавіка** — Марыя Мартысевіч.





**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5560. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.03.2009.
Замова № 1310.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9771819161008 09010